№ 47 (693) 15 снежня 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

П е р ш а я   б е л а р у с к а я   г а з е т а

Заснаваная ў лістападзе 1906. Аднoўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

## У чаканні цуду



Юлія Дарашкевіч

**Ніхто не верыць у выбары, але многія спадзяюцца на Плошчу.**

### Плошча вызначыць палітычную сітуацыю на наступную пяцігодку.

Адразу шэсць кандыдатаў заклікаюць выбарцаў прыйсці на Плошчу 19 снежня. Гэта Віталь Рымашэўскі, Мікола Статкевіч, Андрэй Саннікаў, Рыгор Кастусёў, Уладзімір Някляеў і Яраслаў Раманчук.

Яны клічуць людзей прыйсці на Кастрычніцкую а 20-й гадзіне, пасля сканчэння галасавання. Генеральная пракуратура зрэагавала на заклікі папярэджаннямі.

Клічуць менавіта на Кастрычніцкую плошчу. Яна найбольшая і сімвалічная. На ёй збіраліся і ў 2006 годзе. Тады з лёгкай рукі пісьменніка Уладзіміра Арлова ўдзельнікі намётавага мястэчка пераназвалі яе ў плошчу Каліноўскага.

На яе лёгка выйсці са станцый метро «Кастрычніцкая» і «Купалаўская». Калі ў 2006-м улады закрылі гэтыя дзве станцыі, людскія ручаінкі сцякаліся на яе ад «Нямігі» і «Плошчы Перамогі».

Сёлета на Кастрычніцкай ужо паспелі заліць коўзанку і паставіць вялікую ёлку. Таму ў штабах кандыдатаў людзям напаўжартам-напаўсур'ёзна прапаноўваюць браць з сабой соль і пясок, каб змагацца з лёдам.

Дзеянні арганізатараў ускладняюцца халодным надвор'ем. На 19 снежня сіноптыкі абяцаюць да 18 марозу ўранку і мінус 10—12 увечары. Праўда, без снегу. 19 сакавіка 2006 года большасць мітынгоўцаў разышлася ў часе снежнага шквалу. Тады выказваліся нават меркаванні, што ён быў штучна выкліканы снегавымі пушкамі.

### На выбарах лягчэй

Ва ўмовах, калі няма празрыстага падліку галасоў, менавіта выхад на Плошчу для грамадзян стаў галоўнай праявай іх пазіцыі. Падобнае адбывалася ва ўсіх краінах, дзе выбарцы не былі ўпэўненыя ў справядлівасці вынікаў. Часта паслявыбарчыя пратэсты перарасталі ў перамогу апазіцыі — на Філіпінах, у Сербіі, Грузіі, Украіне.

Пратэстоўцы негвалтоўным шляхам дамагаліся змены ўлады. Волю, прадэманстраваную на вуліцах, немагчыма ігнараваць. Мабілізаваць людзей на вуліцы падчас выбараў нашмат лягчэй.

Міжнародныя назіральнікі пагаджаюцца, што пэўны прагрэс на гэтых выбарах назіраецца. Збор подпісаў адбываўся свабодна, як і сустрэчы кандыдатаў з выбарцамі. Але да прававых нормаў яшчэ вельмі далёка. Найперш таму, што апазіцыя зноў не была ўключаная ў выбарчыя камісіі. Яе там 0,25%. На тэлебачанні дамінуе адзін палітык, якому, паводле звестак маніторынгу Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ, было прысвечана 90% часу, што адводзіцца выбарам. Дзейнасць іншых прэтэндэнтаў не асвятляецца ці асвятляецца ў негатыўным святле.

Па-ранейшаму не адмененае датэрміновае галасаванне. Аназіральнікі кажуць, што менавіта з бюлетэнямі для датэрміновага галасавання адбываецца найбольш фальсіфікацый. Пра іх механізм сёлета падрабязна расказаў палкоўнік Казлоў, які зафіксаваў укідванне падробных бюлетэняў у скрыні ў ноч з суботы на нядзелю падчас парламенцкіх выбараў.

Так і не распрацаваныя да канца абавязкі і правы назіральнікаў. Усё гэта дазваляе гаварыць апазіцыі пра нелегітымнасць працэсу.

**Працяг на старонцы 3.**

### Выбар-2010

- **Здарэнні на дарогах.** Цягам аднаго дня Раманчук трапіў у сур'ёзную аварыю, а Рымашэўскі цудам яе пазбег.
- **Сацыялогія ад Януковіча.** Украінскі экзітпольшчык праславіўся фальсіфікацыяй у часе Аранжавай рэвалюцыі.

**Старонка 2.**

- **Андрэй Дынько: Што, Някляеў, памаглі табе тваe маскалі?** Аляксандр Фядута: Што, Дынько, памаглі табе тваe амерыкосы? Розніца ў мэтах і метадах. Паляміка.

**Старонка 7.**

- **Невядомы герой.** Хто той юнак са сцягам, які ўзлез на дах аўтобуса і стаў адным з герояў Плошчы-2006?

**Старонка 4.**



**Лукашэнка падпісаў АЭП на ўмовах Масквы**

Старонка 5.



**Аўтастопам ад Нью-Ёрка да мыса Горн**

Захапляльныя падарожныя нататкі Аўгіні Манцэвіч.

**Старонка 8.**



**Першая лэдзі Азербайджана**

адхрышчваецца ад інтымнай сувязі з Лукашэнкам

**Старонка 5.**

# Здарэнні на дарогах

**Цягам аднаго дня, 11 снежня, легкавік Яраслава Раманчука трапіў у сур'ёзную аварыю, а аўто Віталя Рымашэўскага цудам размінулася з грузавіком.**

Абодва здарэнні адбыліся ў Гомельскай вобласці. Кандыдат у прэзідэнты Яраслаў Раманчук трапіў у аварыю па дарозе на сустрэчу з выбаршчыкамі ў Рагачоў.

«Фальксвагенам Гольф» кіраваў Іван Лабачоў, побач з ім сядзеў эканаміст Леанід Заіка. Раманчук і сябар яго выбарчага штаба Захар Міхалкін сядзелі ззаду. На 60-м кіламетры трасы Гомель — Мінск на іх паласу з узбочыны рэзка выехала «Аўдзі А3». Да яе было каля дзесяці метраў, таму сутыкнення пазбегнуць не ўдалося.

«Аглушальны ўдар, скрыгат. Салон напоўніўся дымам. Запахла паленым...» — апісвае момант сутыкнення Раманчук. Лабавы ўдар «Фальксвагена» прыйшоўся ў левы бок «Аўдзі». У аўто кандыдата спрацавалі падушкі бяспекі. Кіроўца і пасажыры атрымалі лёгкія траўмы: Лабачоў і Заіка — удары грудной клеткі, Раманчук і Міхалкін — драпіны. Кіроўца «Аўдзі», сяржант міліцыі Павел Хранькоў, і яго пасажырка не пацярпелі.

Палітык быў уражаны тым, якімі спакойнымі і дзёрзкімі былі кіроўца і пасажырка з «Аўдзі»: нібы і не трапілі толькі што ў сур'ёзную аварыю — адразу «прапанавалі дамовіцца».

Выкліканыя супрацоўнікі ДАІ і «хуткай» прыехалі з Рагачова (40 км) за 40 хвілін.



**Падушкі бяспекі ўратавалі Яраслава Раманчука.**

У той самы дзень пра здарэнне з удзелам аўто кандыдата паведаміла прэс-служба БХД. Легкавік ледзь не трапіў пад колы грузавіка. Здарылася гэта за 10 км ад месца аварыі з удзелам аўто Раманчука. Падрабязнасці распавёў кіроўца Рымашэўскага Вадзім. Яны ўдвух вярталіся на «Сітраэне» з Гомеля. На трасе Гомель — Мінск насустрач ім трапілася мяшаная калона з грузавікоў і легкавых аўто. Калі «Сітраэн» палітыка параўняўся з сярэдзінай калоны, адзін грузавік, не ўключаючы сігнал павароту, нечакана выехаў на сустрэчную і пачаў абганяць легкавік, што ішоў спераду. «Мне давялося рэзка збочваць. А гэта рызыкоўна, бо калі колы трапляюць на ўзбочыну, машыну можа кінуць куды заўгодна». Вадзім пэўны, што гэта не выпадковасць. Ён мае амаль 20-гадовы стаж кіроўцы і кажа, што яшчэ не бачыў, каб грузавік у такіх умовах выязджаў на сустрэчную. Пасля інцыдэнту ён не спыніў аўто. Не спыніўся і грузавік.

Прэс-служба БХД расцаніла інцыдэнт з аўто кандыдата як пагрозу яму і яго сям'і.

**Сямён Печанко**

## СЦІСЛА

• **Шматдзетная маці трымае галадоўку ў Магілёве.** Ужо тыдзень галадае Наталля Шкадун, доктарка станцыі пералівання крыві. Яна патрабуе ад уладаў палепшыць яе жыллёвыя ўмовы. Яна 12 гадоў стаіць у чарзе на жыллё. У яе пяцёра дзяцей. Сям'я жыве ў кватэры агульнай плошчай 63 кв. м, хоць, згодна з законам, патрэбна жыллё плошчай не менш як 117 кв. м.

• **Пад выбары чакаецца мароз.** 16 снежня ў краіне пройдзе кароткачасовы снег. Тэмпература паветра днём мінус 6—13°С. 17 снежня — пераважна без ападкаў, толькі днём па Гомельскай вобласці кароткачасовы снег. Тэмпература паветра ноччу мінус 8—15°С, пры праясненнях да мінус 17—23°С; днём мінус 6—13°С. Моцныя маразы захаваюцца да канца тыдня.

• **У Лондане памёр брат Ларысы Геніюш.** Аляксею Міклашэвічу было 87 гадоў. У 1940-м ён быў высланы ў Казахстан, у складзе арміі Андэрса ўдзельнічаў у бітве з нацыстамі пры Монтэ-Касіна. Пасля вайны застаўся жыць у Вялікабрытаніі. Дапамагаў матэрыяльна сястры, калі тая, вярнуўшыся з ГУЛАГа, жыла ў Зэльве.

• **У Кішынёве адчыняецца нядзельная беларуская школа.** Арганізавала яе Беларуская суполка ў Рэспубліцы Малдова. У школу набіраецца 15—20 вучняў. Усяго ў Малдове жыве каля 20 тысяч беларусаў.

• **Юрый Жаўноў — футбаліст года.** Паводле рэйтынгу газеты Беларускай федэрацыі футбола «Всё о футболе» найлепшым гульцом краіны прызнаны варатар зборнай Беларусі і пецярбургскага «Зеніта» Юрый Жаўноў. Найлепшым трэнерам 2010 года быў названы галоўнакамандуючы барысаўскага БАТЭ Віктар Ганчарэнка.

**СМ**

# Сацыялогія ад Януковіча

**Экзітпольшчык з «TNS–Украіна» праславіўся фальсіфікацыяй у часе Аранжавай рэвалюцыі.**

Сацыялагічную кампанію, якая ладзіць экзіт-пол на гэтых выбарах у Беларусі, у 2004-м зславілі на падтасоўцы вынікаў за Януковіча.

### То за Януковіча, то за Юшчанку

Сёлета выбарчыя экзіт-полы (апытанні людзей па выхадзе з участкаў) будуць ладзіць не толькі праўладныя «Экаом» і БРСМ, як у 2006-м. Тэлеканал АНТ запрасіў ладзіць апытанне ўкраінскую сацыялагічную кампанію «TNS-Украіна».

Выявілася, што кампанія, якая ўзялася за правядзенне экзіт-полаў у Беларусі, мае цёмнае мінулае. У склад «TNS-Украіна» ўваходзіць агенцтва маркетынгавых і сацыяльна-палітычных даследаванняў SOCIS. Гэта даволі вядомая служба.

Абедзве арганізацыі ўзначальвае адзін і той жа чалавек — доктар сацыялагічных навук Мікалай Чурылаў. SOCIS уляпаўся ў гучную гісторыю падчас прэзідэнцкіх выбараў ва Украіне ў 2004. У першым туры кампанія фіксавала невялікую перавагу Юшчанкі. Але ў афіцыйных лічбах на першае месца выйшаў яго супернік Януковіч. Калегі-сацыёлагі нават рабілі сумесную заяву аб фальсіфікацыях з боку SOCISa. Чурылаў потым дэманстратыўна «вярнуў перамогу» Юшчанку і выйшаў са складу «Нацыянальнага экзіт-пола».

Падчас другога тура сацыёлагі зноў абвясцілі перамогу Віктара Януковіча. Хоць у папярэдніх выніках выйграваў Юшчанка, Чурылаў заявіў пра першае месца для Януковіча. Усе астатнія экзіт-полы зафіксавалі перамогу Юшчанкі, што даказалі і далейшыя падзеі.

«Асноўны ўрок, які я вынес з той выбарчай кампаніі, — быць далей ад палітыкі і добра рабіць сваю справу. Сёння я пэўны ў сваёй рэпутацыі, ніводная коска не будзе адрэдагаваная», — кажа М.Чурылаў.

### Суд з Цігіпкам

Пасля дыскрэдытацыі SOCISa Чурылаў імкнуўся дзейнічаць пад шыльдай «TNS-Украіна», што ўваходзіць у міжнародны холдынг са штаб-кватэрай у Лондане. Гэтая кампанія не мае такой скандальнай славы. Але і на сёлетніх выбарах не абышлося без гучных справаў. У фальсіфікацыях TNS абвінавaціла каманда кандыдата Сяргея Цігіпкі.

Кандыдат нават падаваў у суд на сацыялагічную службу. «Калі б мы жылі ў дэмакратычнай краіне, то Чурылаў даўно б быў беспрацоўным», — кажа іншы ўкраінскі сацыёлаг Кучараў.

Падчас нядаўніх гарадскіх выбараў у Чаркасах SOCIS таксама рабіў даследаванні. Па іх звестках, яўка павінна была скласці 70%, але на самай справе прыйшло ўсяго 27%.

### Лукашэнку пішуць тры чвэрці

У Беларусі на выбарах будзе працаваць толькі пяць работнікаў з Украіны. Астатнія — навучэнцы беларускіх ВНУ. У інтэрв'ю «НН» Чурылаў прызнаў, што з беларускімі кадрамі «існуюць пэўныя праблемы».

Чурылаў распавёў, што некалькі тыдняў таму кампанія ладзіла папярэдняе даследаванне перадвыбарчых настрояў у краіне. «Прыцягнулі да працы новых людзей. Аднак яны правалілі працу: атрыманыя лічбы істотна адрозніваліся ад папярэдніх», — кажа Чурылаў. Праблемы былі зафіксаваныя ў Віцебскай вобласці: замнога апыталі моладзі і людзей з вышэйшай адукацыяй. «Даверу такім лічбам няма», — адзначыў Чурылаў і не пагадзіўся нават іх паведаміць.

Праўда, праз некалькі хвілін ён сам патэлефанаваў у рэдакцыю, каб сказаць лічбы. Паколькі за пяць дзён да галасавання вынікі сацапытанняў публікаваць забаронена, мы тут іх не падаём.

Чурылаў кажа, што лічба падтрымкі Лукашэнкі ад лістапада да снежня не змянілася істотна.

Мікалай Чурылаў абяцае, што вынікі экзіт-полаў будуць абвешчаныя ў нядзелю 19 снежня ў 20.01. Сацыёлаг перакананы, што на гэты раз праблем з падлікам у іх не павінна ўзнікнуць.

**Зміцер Панкавец**

### Самае чытанае на nn.by за 8 — 14 снежня

- Агітацыйны хіт–2010 — дзеці спяваюць пра «Бацьку–прэзідэнта»
- Што, Някляеў, памаглі табе твае маскалі?
- Някляеў заклікаў усіх кандыдатаў зняцца з прэзідэнцкіх выбараў
- Лукашэнка падпісаў АЭП на ўмовах Масквы
- Кандыдаты з выбараў здымацца не будуць
- Што за выбары без песні + відэа
- Белсат: жорсткая размова з кандыдатамі
- Лукашэнка: Прэзідэнцкія выбары прывядуць да палітычных перамен у краіне
- Раманчук: Лукашэнкаўцы прапануюць мне ўзначаліць урад
- Памерла спявачка Вольга Самусік


## Не ўсё ў жыцці апошні раз!

**Падпіска праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 4 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

**Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.**

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты:**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

**Падпіска праз «Белпошту»**

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

**Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»:** для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

**Дзякуй падпісчыкам, якія падпісваюцца праз Рэдакцыю**

**Мікалаю К.** з Наваполацка.

**Пятру А.**, **Яўгену М.** з Мінскага раёна.

**Льву М.** з Пінска.

**Васілю Ф.**, **Марыне А.**, **В.Ч.**, **А.С.** з Мінска.

# У чаканні цуду

Працяг са старонкі 1.

### Дзевяць генералаў

Няясным застаецца тое, ці змогуць дзевяць «генералаў» адначасова кіраваць падзеямі на Плошчы. Вядома, што агульнага бачання ў іх пакуль няма.

Уладзімір Някляеў і Андрэй Саннікаў пра каардынацыю дзеянняў дамовіліся задоўга да выбараў. «Мы размаўляем з Някляевым наконт Плошчы», — кажа А.Саннікаў.

«Павінна быць агульная стратэгія на Плошчы, створаны камітэт з тых кандыдатаў, усіх ці амаль усіх, якія запрашалі на Плошчу. Ён будзе прымаць рашэнні па яе фармаце, правядзенні і гэтак далей. Выканаўцам прынятых рашэнняў даручана быць мне», — кажа М.Статкевіч. Паводле яго словаў, на сустрэчы прысутнічаў Віталь Рымашэўскі, а таксама прадстаўнікі Уладзіміра Някляева, Ярослава Раманчука і Рыгора Кастусёва. Але канчатковай згоды са штабоў Саннікава і Някляева пакуль няма.

Такім чынам, кандыдаты спрабуюць размаўляць і дамаўляцца, але рэальнай застаецца магчымасць таго, што ў Плошчы можа быць некалькі пунктаў кіравання. Умоўна кажучы, адзін узначаліць Уладзімір Някляеў, а другі — Мікола Статкевіч. І імавернай разрозненасць дзеянняў пойдзе на шкоду Плошчы.

Колькі прыйдзе людзей сёлета? Адны кажуць пра пяць тысяч, іншыя — пра пяцьдзясят. У любым выпадку, яна стане самай масавай маніфестацыяй апазіцыі за апошнія гады.

У сацыяльнай сетцы «Укантакце» група «Плошча-2010» дасягнула 130 тысяч чалавек.

### Практычныя парады

Статкевіч заклікаў аўтааматараў не карыстацца асабістым транспартам вечарам 19 снежня ў цэнтры Мінска ці выключыць са сваіх маршрутаў раён Кастрычніцкай плошчы.

«Могуць утварыцца заторы, і будзеце стаяць у іх некалькі гадзін», — сказаў Статкевіч.

Іншыя кандыдаты нагадваюць людзям пра цёплую вопратку і камфортны абутак, якія захаваюць ад марозу.

### Сцэнары

Кандыдаты абяцаюць, што сцэнары на 19 снежня ў іх маюцца. Прычым распрацоўваюцца самыя розныя варыянты. Ясная справа, што для прэсы іх не агучваюць. Баяцца, што гэтым скарыстаюцца ўлады.

Пасля 2006 года шмат хто імкнуўся папракнуць Мілінкевіча, што ў яго не было ясннага плана. Пазней Мілінкевіч прызнаецца, што ён не верыў, што ўлады пусцяць іх на Кастрычніцкую. Цяпер у кандыдатаў ёсць магчымасць даказаць, што яны лепшыя стратэгі і тактыкі за Мілінкевіча.

Казаць, што нехта з кандыдатаў пераможа, хутчэй за ўсё, не будуць. Патрабаваць другога тура — малаімаверна. Больш верагодны варыянт — правядзенне новых, справядлівых выбараў. Рымашэўскі прапануе распачаць агульнанацыянальную забастоўку.

Пасля мінулых выбараў на другі дзень моладзь разбіла на Плошчы намётавае мястэчка, якое праіснавала чатыры дні.

Тады шмат хто казаў пра маральную перамогу. Пра перамогу рэальную пакуль ніхто не гаварыў.

Тым не менш, сёлета кожны чалавек выходзіць на Плошчу ў чаканні цуду. Хай і не кажуць пра тое ўслых.

Ну а добры настрой для ўдзельнікаў павінен быць забяспечаны. Мінулая Плошча дала моцны зарад энергіі, якім жывіліся наступныя гады.

Палітолаг Віталь Сіліцкі кажа, што градус страху на гэтых выбарах непараўнальна меншы, чым у 2006-м. «Шмат хто можа прыйсці на Кастрычніцкую проста з цікавасці», — зазначае аналітык.

У нядзелю вечарам мы даведаемся адказы на ўсе пытанні.

**Зміцер Панкавец**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Макей далучыўся да застрашвання

Як і ў 2006-м, улады нагнятаюць істэрыю.

У 2006 годзе кіраўнік КДБ, генерал Сухарэнка праславіўся байкай пра падпалы і дохлых пацукоў. Сёлета пытаннем заняўся кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта.

«Апазіцыйныя кандыдаты насамрэч рыхтуюць правакацыі, у тым ліку з прымяненнем выбуховых рэчываў», — паведаміў у эфіры канала «РТР-Беларусь» Уладзімір Макей.

«Ужо рыхтуюцца групы баевікоў, ужо закупляюцца цёплыя рэчы, піратэхнічныя і нават выбуховыя рэчывы, — распавёў кіраўнік прэзідэнцкай адміністрацыі. — Таму апазіцыйныя кандыдаты адназначна нацэльваюць людзей на стварэнне выдатнай «карцінкі» для заходняга тэлебачання».

Макей таксама дадаў: «Думаю, што ва ўлады дастаткова сіл і сродкаў, каб адрэагаваць спакойна і годна на падобнага роду сітуацыю».

Дырэктар Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр Зімоўскі падхапіў лінію ў сваім блогу на сайце naviny.by. «Што тычыцца дзеяння сілаў грамадскай бяспекі, то, па вялікім рахунку, будзе стандартная паліцэйская аперацыя — блакіраванне, лакалізацыя, рассейванне. Пры гэтым біць нельга, а тактыка «мяккай сілы» моцна абмяжоўвае баявыя магчымасці спецпадраздзяленняў — натоўп прыбывае і не баіцца. Пачынаецца братанне, абмен «Чаромхі-10» на гваздзікі, з'яўляюцца дзяўчынкі, магчыма, святары і, як вынік, маральнае разлажэнне грознага праваслаўнага воінства. І хто паручыцца, што вынікам вайны нерваў не стане другі тур?» — напісаў А.Зімоўскі.

«Плошчавыя гульні не даводзяць да дабра», — гучыць загаловак на першай паласе «Советской Белоруссии». У ім зазначаецца, што праваахоўныя органы гатовы да прэзідэнцкіх выбараў.

**МБ, ЗП**

# Як пройдзе Плошча?

Меркаванні экспертаў.

**Журналіст-аналітык Аляксандр Класкоўскі: Ні ўлада, ні апазіцыя не зацікаўленыя ў сілавым сцэнары**

Лічба ўдзельнікаў: мой прагноз — ад 15 да 25 тысяч, трохі больш, чым у 2006-м. Сёлета ўмовы, з аднаго боку, больш спрыяльныя (улады аказваюць меншы ціск), а з іншага — менш (адсутнічае адзіны кандыдат).

Вялікі уплыў на Плошчу акажуць умовы надвор'я.

Што датычыць сцэнара, то сёння ні ўлада, ні апазіцыя не зацікаўленыя ў сілавым сцэнары.

**Палітолаг Юры Чавусаў: Самы небяспечны варыянт — падзел**

Плошча несумненна адбудзецца. Людзі прыслухоўваюцца да кандыдатаў. Махавік пратэстаў запушчаны.

Хачу адзначыць, што ў 2006 годзе для напаўнення Плошчы шмат зрабіў Сухарэнка. Людзей мабілізавалі яго заявы. Так можа быць і сёлета. Ціск будзе мець адпаведную рэакцыю.

Самы небяспечны варыянт — падзел. Калі адны застануцца на Плошчы, а другія пойдуць да ЦВК. І тут не абавязкова падзел на прарасійскіх і празаходніх. Падзел паводле стратэгіі дзеянняў таксама аслабіў бы моц пратэсту.

**Медыяаналітык Уладзімір Падгол: Нельга выключаць, што адбудзецца трагедыя з некім з кандыдатаў**

Выпадкі з аўтамабілямі Раманчука і Рымашэўскага дазваляюць так меркаваць. Тады магчыма, што на Плошчу выйдзе і дзвесце тысяч чалавек. Калі ж нічога не адбудзецца, то кандыдаты збяруць дзесяць тысяч.

**Рэдактар сайта Imperyja.by Юрый Баранчык: Я прагназую, што ў першы дзень, 19 снежня, на Плошчу выйдзе 40—50 тысяч людзей**

Колькі будзе потым — складана сказаць. Апазіцыя павінна пратэставаць на працягу тыдня.

Я думаю, што ў першыя дні ўлады будуць пасіўнымі назіральнікамі. Потым могуць распачацца дзеянні. Асабліва ў тым выпадку, калі выбары не прызнаюць Расія, ЕС і ЗША. Гэта стане вядома ўжо ў аўторак-сераду, і тады пачнецца рэальнае супрацьстаянне з уладамі. Альбо скончыцца.

**Апытваў Алесь Пілецкі**

АПЫТАННЕ

# Ці будзеце вы на Плошчы?

**Лявон Вольскі, спявак:** Я пайду на Плошчу. 19 снежня буду цэлы дзень сядзець на ўчастку ў якасці назіральніка. Гэта мяне натхніць яшчэ больш.

**Франц Сіўко, пісьменнік:** Я не збіраюся. Жыву ў Віцебску, прыхвараў. Ды і працую пры касцёле, а акурат пачынаецца адказны перыяд перад Калядамі.

**Ян Маўзер, музыка:** Вядома. Нешта змяніць можна толькі акцыямі пратэсту. Мне падабаецца, што кандыдатаў шмат. Яшчэ адзін фактар — развіццё інтэрнэту. Скрозь бачныя запрашэнні на Плошчу, прычым іх распаўсюджваюць не штабы, а простыя людзі.

**Уладзімір Арлоў, пісьменнік:** У дачыненні да мяне такое пытанне гучыць рытарычна. Вядома, пайду.

**Вячаслаў Кебіч, былы прэм'ер-міністр:** Масавых пратэстаў у тым выглядзе, як пра гэта марыць апазіцыя, у Беларусі не будзе. Сапраўдная «Плошча» ў беларускай гісторыі была толькі аднойчы: у пачатку 90-х, калі адпусцілі цэны. Цяпер для такіх масавых акцый пратэсту няма сацыяльна-эканамічных перадумоў.

**Жанна Літвіна, кіраўніца Беларускай асацыяцыі журналістаў:** На Плошчы я буду, побач з калегамі. На жаль, сёлета няма адзінага кандыдата, адзінай альтэрнатывы. Але праява ўласнай грамадзянскай пазіцыі — гэта важна.

**Апытваў Алесь Пілецкі;**
**Кебіча — БЕЛТА**

# Ключ ад сталіцы

**Кастрычніцкая плошча: што на ёй было, што на ёй і пад ёй цяпер, што яна значыць.**

Сваім з'яўленнем Кастрычніцкая плошча абавязаная савецкай уладзе. Яшчэ да пачатку 1940-х гадоў на тым месцы стаялі будынкі. А калі зазірнуць глыбей у гісторыю, убачым гарадскі вал, Святаюраўскую царкву з аднайменнай вуліцай. На той вуліцы, дарэчы, размяшчалася рэдакцыя газеты «Северо-западная жизнь», у якой упершыню надрукаваўся Янка Лучына. На Юраўскай паэт і жыў. Да сёння ад вуліцы захаваліся два дамы — у двары паміж Палацам прафсаюзаў, Музеем ВАВ, 24-й школай і Домам ветэранаў.

Быў тут і палац Сапегаў, у якім падчас Паўночнай вайны ў XVIII ст. спыняўся гетман Мазепа. Але савецкія гісторыкі называлі будынак «домікам Пятра», бо расійскі цар Пётр І таксама ў ім кватараваў.

У канцы 1940-х узбоч будучай плошчы пачалі будаўніцтва Палаца культуры прафсаюзаў. Знішчылі касцёл Святога Тамаша Аквінскага і дамініканскі кляштар, які стаяў на месцы насупраць цяперашняга будынка аблвыканкама. Сфармавалі ж плошчу ў духу савецкай гігантаманіі падчас узвядзення дзесяціметровага помніка Сталіну ў 1952 годзе. «Беларускі» Сталін меў на п'едэстале арнамент, як на сцягу БССР і на цяперашнім лукашэнкаўскім. Паміж плошчай і скверам у той самы час паставілі гранітныя ўрадавыя трыбуны.

У 1961-м Сталіна знеслі. На яго месцы пазней, за Машэравым, пачалося ўзвядзенне Палаца рэспублікі. Скончалі яго ўжо за Лукашэнкам.

Сённяшнюю назву Кастрычніцкая плошча атрымала ў 1977 годзе. А да таго яе называлі Цэнтральнай. Хоць функцыі цэнтральнай плошчы горада яна пераняла толькі ў XXI стагоддзі. Да сярэдзіны 1990-х галоўнай у Мінску была плошча Незалежнасці — там стаяў статысячны натоўп рабочых, патрабуючы аддзялення ад СССР, туды, да Вярхоўнага Савета, ішлі патрабаваць імпічменту Лукашэнкі ў 1996-м.

Пасля парламент страціў вагу ў краіне, а Лукашэнка стаў надаваць функцыі найважнейшай Кастрычніцкай плошчы — бліжэйшай да Чырвонага дома. Канчаткова знакавы статус замацаваўся за ёй у 2006 годзе, калі плошча стала месцам, дзе вызначалася палітычная будучыня краіны.

Там, між Палацам Рэспублікі і праспектам Незалежнасці, паўстаў намётавы гарадок. Пяць дзён, ад 19 да 24 сакавіка, на лютым марозе моладзь пратэставала супраць фальсіфікацыі прэзідэнцкіх выбараў. Гарадок ліквідаваў уначы спецназ. Больш за 1000 чалавек было арыштавана.

З лёгкай рукі Уладзіміра Арлова плошчу тады перназвалі ў Пляц Каліноўскага. Але слова Плошча захавалася як імя ўласнае. Гэтае слова з таго часу пазначае не толькі назву пэўнага месца, але і пэўны сцэнар дзеянняў. Як і ўкраінскі «Майдан».

Пасля падзей сакавіка 2006-га Лукашэнка некалькі тыдняў не паказваўся на тэлебачанні, а пазней правёў на Плошчы інаўгурацыю. Дывановую дарожку, па якой ён ішоў, праклалі праз месца, дзе стаяў намётавы лагер.

Кіраўніцтва краіны ведае, што ў выпадку непрадбачанага развіцця сітуацыі шляхі адступлення таксама ляжаць праз плошчу. Дакладней, пад ёй: яшчэ ў часе будаўніцтва метро будынак ЦК КПБ (цяпер — Адміністрацыя прэзідэнта) звязалі камунікацыямі са станцыяй «Кастрычніцкая», Палацам рэспублікі, выхадамі ў розныя бакі — цэлы падземны горад з камунікацыямі.

Цяпер на Кастрычніцкай і побач з ёй, апроч Палаца рэспублікі, размяшчаюцца Музей гісторыі вайны, Палац культуры прафсаюзаў, Мінаблвыканкам, фантан, у які летам купаюцца дзеці і дэсантнікі.

З боку праспекта да плошчы прымыкае Цэнтральны сквер, у якім усталявана скульптура «Хлопчык з лебедзем». У асяродку нефармалаў гэтае месца вядомае як «Панікоўка», праз падабенства хлопчыка з лебедзем да героя Ільфа і Пятрова. Тут збіраліся нефармалы, асабліва да забароны піць алкаголь на вуліцах. Побач Дом афіцэраў, Купалаўскі тэатр, у якім у 1917 годзе сабраўся Усебеларускі з'езд, які заклаў першаасновы незалежнасці.

На плошчы стаіць і «нулявы кіламетр» — сімвалічны пункт пачатку беларускіх дарог.

**Кастусь Матушыч**




**1. Палац рэспублікі. Да 1961 тут стаяў помнік Сталіну. 2. Купалаўскі тэатр. Тут у 1917 сабраўся Усебеларускі з'езд. 3. Адміністрацыя прэзідэнта. 4. Дом прафсаюзаў. У 2001 яго захапілі «зубры». 5. Музей ВАВ. 6. Аляксандраўскі сквер. Панікоўка. 7. Дом афіцэраў. 8. Тут стаяў намётавы гарадок. 9. Тут юнак са сцягам залез на аўтобус. 10. Помнік Янку Купалу.**




Юлія Дарашкевіч

# Невядомы герой

**Хто той юнак са сцягам, які ўзлез на дах аўтобуса і стаў адным з герояў Плошчы–2006?**

Вечар 19 сакавіка 2006 года. Кастрычніцкая плошча. На ёй сабралася каля дваццаці тысяч чалавек, што не спалохаліся анансаваных тагачасным старшынёй КДБ выбухаў і дохлых пацукоў.

У паветры адрэналін. Людзі, якія пераадолелі свой страх, жыва рэагуюць на падзеі вакол. Мужчына сталага веку з плакатам у падтрымку Лукашэнкі выклікае рогат, Лукашэнка на экране — здзеклівыя воклічы і свіст.

Над плошчай лунае мора сцягоў. Адзін з іх нечакана ўздымаецца вышэй і праплывае паўз натоўп у бок Плошчы Незалежнасці. Гэта невядомы хлопец з захутаным тварам ускараскаўся на дах гарадскога аўтобуса №100 і з бел-чырвона-белым сцягам у руках у бліскаўках фотакамер праехаў сотню метраў заслужанай славы.

Плошча вітала яго воплескамі. Ён быў прызнаны (і не толькі «Нашай Нівай») чалавекам 2006 года.

Хто гэта быў, журналісты так і не высветлілі. Гаварылі, што гэта хлопец з Гродна.

Да Плошчы-2010 засталіся лічаныя дні. Дзе той чалавек са сцягам? Ці з'явіцца ён на Плошчы зноў?

**Сямён Печанко**

# Хто з кандыдатаў што рабіў у часе Плошчы-2006?

Сёлета адразу шэсць кандыдатаў заклікаюць выбарцаў прыйсці на Плошчу 19 снежня і далучыцца да супольнай акцыі апазіцыі. Гэта Віталь Рымашэўскі, Мікола Статкевіч, Андрэй Саннікаў, Рыгор Кастусёў, Уладзімір Някляеў і Яраслаў Раманчук.

Мы пацікавіліся, ці былі яны на Плошчы ў 2006-м і што там рабілі.

### Рымашэўскі: быў гатовы

Віталь Рымашэўскі ў 2006-м не толькі быў на Плошчы, але і актыўнічаў там. «Я займаўся зборам подпісаў за адзінага кандыдата па Фрунзенскім раёне Мінска. Меў разгалінаваную сетку кантактаў. І вечарам 19 сакавіка мы ўсе былі на Плошчы, гатовыя дзейнічаць. Аднак са штаба ніякіх камандаў не паступіла», — распавёў карэспандэнту «НН» Віталь Рымашэўскі.

### Някляеў: на Плошчы-2006 заклікаў да Плошчы-2010

Лідар кампаніі «Гавары праўду!» Уладзімір Някляеў таксама быў на акцыі ў 2006-м. «Я быў тады ў камандзе Казуліна. І выступаў на той Плошчы, і заклікаў. Заклікаў да Плошчы-2010, як цяпер можна здагадацца», — кажа спадар Някляеў.

### Кастусёў: сядзеў на сутках

Рыгор Кастусёў, кандыдат ад БНФ, у сакавіку 2006-га на Плошчы не быў: «За тры дні да 19 сакавіка мяне арыштавалі. Я тады быў давераная асоба Аляксандра Мілінкевіча і, вядома, збіраўся 19 сакавіка быць у Мінску».

### Статкевіч: на «хіміі»

Пад вартай 19 сакавіка знаходзіўся і Мікола Статкевіч. Ён тады адбываў «хімію» ў Баранавічах. «За месяц да акцыі мяне перасталі пускаць на працу. Са мной у пакоі пастаянна знаходзіліся міліцыянты — баяліся, што ўцяку на Плошчу», — згадвае Мікола Статкевіч.

### Раманчук і Саннікаў: у камандзе Мілінкевіча

Кандыдат ад партыі АГП Яраслаў Раманчук у 2006 годзе быў на Плошчы: «Я працаваў у камандзе Мілінкевіча на тых выбарах і не мог не быць там».

Удзел у мірнай акцыі 19 сакавіка 2006 года браў і Андрэй Саннікаў, каардынатар «Еўрапейскай Беларусі». «Ён быў на Плошчы разам з жонкай. Ён тады працаваў у камандзе Мілінкевіча на агульную перамогу», — паведаміў «НН» прэс-сакратар кандыдата Аляксандр Атрошчанкаў.

**Алесь Пілецкі**

### Гісторыя Плошчаў

**9 верасня 2001**

Прэзідэнцкія выбары. На Кастрычніцкай плошчы сабралася каля 5 тысяч чалавек. Уладзімір Ганчарык, які прадстаўляў на прэзідэнцкіх выбарах апазіцыйныя сілы, з'явіўся на мітынг з вялікім спазненнем. Прысутныя сабраліся каля Палаца прафсаюзаў. Перад мітынгоўцамі выступілі Ганчарык, Міхаіл Чыгір, Юры Хадыка, Вінцук Вячорка. Пасля Ганчарык заклікаў усіх разыходзіцца. Але «зубры» трымалі абарону Палаца прафсаюзаў да ранку.

**19 сакавіка 2006**

Прэзідэнцкія выбары. На плошчы сабралася каля 20 тысяч чалавек. Людзі прыйшлі, нягледзячы на моцныя запалохванні тэрактамі і арыштамі. У часе мітынгу ішоў моцны снег, у выніку чаго маніфестанты сталі разыходзіцца. На заклік Мілінкевіча і Казуліна яны сабраліся на Плошчы і на наступны вечар. Тады моладзь стварыла намётавы гарадок, які спецназ узяў штурмам толькі праз 4 дні, 24 сакавіка. 25 сакавіка, на Дзень Волі, некалькі дзясяткаў тысяч дэманстрантаў спрабавалі авалодаць цэнтрам Мінска, але спецназ выціснуў іх у парк Янкі Купалы. Ад сакавіка 2006 і пайшла назва Плошча.

**СП**

# Лукашэнка падпісаў АЭП на ўмовах Масквы

Масква, як чакаецца, узамен прызнае выбары.

Беларусь ратыфікуе дакументы па стварэнні Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП) да 1 студзеня 2011 года, заявіў Аляксандр Лукашэнка на прэс-канферэнцыі па выніках саміта ў Крамлі 9 снежня.

Як паведамляюць рэпарцёры, і Лукашэнка, і Мядзведзеў былі ў гуморы пасля перамоваў, аж перабівалі адзін аднаго, гэтак спяшаліся распавесці пра дамоўленасці.

А яны палягаюць на наступным. Беларусь падпісала дамову аб стварэнні АЭП. У адказ Расія ад моманту ўступлення Дамовы ў сілу — магчыма, ад 1 студзеня — зніме мыты на пастаўку нафты ў Беларусь. Але Беларусь будзе абавязаная вяртаць у расійскі бюджэт усе мыты ад экспарту нафтапрадуктаў. Усе 100%, не 75, як хацела Беларусь. У гэтым сэнсе Масква цалкам навязала свае ўмовы.

Гэтая ўгода дазволіць загрузіць беларускія заводы, але яна не дапаможа напоўніць дзяржаўны бюджэт. Расія з дапамогай такой схемы прывязвае беларускія заводы да расійскай сыравіны і спадзяецца сарваць планы дыверсіфікацыі паставак энерганосьбітаў у Беларусь.

АЭП — пешчанае дзіця Пуціна. Праз АЭП Пуцін спадзяецца надзейна прывязаць эканомікі Беларусі і Казахстана да расійскай. Гэта, на ягоную думку, мае пакласці пачатак стварэнню «Расійскага свету», альтэрнатыўнага Еўрасаюзу.

Невыпадкова пасля стварэння АЭП Расія пераходзіць да наступнай ідэі: Мядзведзеў вылучыў прапанову стварэння Еўразійскага саюза.

«За паўгода мы здымем праблемы і сфармуем Еўразійскі саюз».

«Я абсалютна падтрымліваю такую ідэю. Беларускія людзі, эксперты, кіраўнікі зробяць усё, каб актыўна тут працаваць. Думаю, што за паўгода мы здымем вельмі многія праблемы і сфармуем Еўразійскі саюз, які будзе вельмі магутным аб'яднаннем», — захоплена падхапіў Лукашэнка. «У выніку хачу расчараваць тых, хто марыў аб нейкім развале, разыходжанні, усё выйшла наадварот — мы нармальна папрацавалі і здзейснілі прарыў у нашых адносінах», — сказаў Лукашэнка.

«Мы, я гэта абяцаю, зробім раней і Расіі, і Казахстана, але Беларусь зробіць гэта абсалютна ў тэрмін — да 1 студзеня», — заявіў ён адносна ратыфікацыі дамовы пра АЭП.

Нагадаем, што Пуцін быў падкрэсліў: бязмытная нафта пацячэ толькі пасля ратыфікацыі, а не пасля падпісання.

Адказваючы на пытанне аб супрацоўніцтве з ЕС, прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў: «Існуюць цывілізаваныя прынцыпы стварэння такіх адносін. Гэта павінна быць дарога з двухбаковым рухам. Калі мы працягнем рухацца ў такім тэмпе, то ўжо ЕС будзе думаць, як з намі наладзіць супрацоўніцтва».

Сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Дзмітрыя Мядзведзева адбылася ў Маскве да пачатку пасяджэння найвышэйшага органа Мытнага саюза. Кіраўнікі дзяржаў размаўлялі больш за паўтары гадзіны ў фармаце сам-насам.

Пра гэта паведаміў БЕЛТА кіраўнік прэс-службы кіраўніка беларускай дзяржавы Павел Лёгкі.

Па ініцыятыве расійскага боку прэса не прысутнічала на перамовах.

Расійскія эксперты адзначылі адразу пасля падпісання дакументаў, што Расія з усёй верагоднасцю прызнае вынікі выбараў у Беларусі, бо дабілася таго, чаго хацела, ад Лукашэнкі.

**Мікола Бугай**

## Першая лэдзі Азербайджана адхрышчваецца ад інтымнай сувязі з Лукашэнкам

Яна абурылася публікацыяй італьянскай газеты «Фолья».



Пратакольная служба першай лэдзі Азербайджана распаўсюдзіла заяву, у якой выказвае абурэнне публікацыяй італьянскай газеты Il Foglio пра нібыта рамантычныя сустрэчы Мехрыбан Аліевай з Аляксандрам Лукашэнкам у Берліне.

У заяве гаворыцца: «Першая лэдзі Азербайджана, прэзідэнт Фонду Гейдара Аліева, пасол Добрай волі ЮНЭСКА і ІСЭСКА, дэпутатка парламента Азербайджана Мехрыбан Аліева вядомая далёка за межамі нашай краіны дзякуючы сваёй актыўнай і шматграннай дзейнасці, накіраванай на актывізацыю дыялогу культур і цывілізацый, павышэнне ролі жанчын у палітычным і грамадскім жыцці. Відавочна, што рост аўтарытэту першай лэдзі Азербайджана, краіны, што знаходзіцца ў няпростай геапалітычнай сітуацыі, у насычаным канфліктамі рэгіёне, выклікае нервовую рэакцыю у некаторых колах».

У артыкуле пад назвай «У ложку пад Берлінам» 3 снежня газета Il Foglio са спасылкай на дыпламатаў напісала пра тое, што «ў Берліне рамантычная сувязь паміж прыгажуняй Мехрыбан і вусатым Лукашэнкам — сакрэт Полішынэля».

Пратакольная служба Мехрыбан Аліевай афіцыйна запатрабавала ад газеты Il Foglio прынесці прабачэнні і надрукаваць абвяржэнне.

У заяве гаворыцца, што Азербаджан пакідае за сабой права звярнуцца ў суд з пазовам аб абароне гонару і годнасці першай лэдзі.

Назіральнікі не выключаюць, што публікацыя магла быць правакацыяй спецслужб трэцяй краіны. Адносіны Беларусі і Азербайджана набіраюць абароты, Аліеў і Лукашэнка мацуюць асабістыя сувязі. Найбольш гучным іх праектам стала ідэя паставак азербайджанскай нафты ў Беларусь у абыход Расіі.

Што цікава, газета «Фолья» належыць былой жонцы Сільвія Берлусконі.

**МБ**

## Студэнтаў адпраўляюць на датэрміновае і распускаюць па дамах

Як паведамілі «Нашай Ніве» студэнты Брэсцкага дзяржаўнага політэхнічнага ўніверсітэта, у іх адменены заняткі ў чацвер і пятніцу. Дэканы загадалі студэнтам датэрмінова прагаласаваць, а пасля гэтага — ехаць дамоў.

Супрацоўнікі ўніверсітэта пацвердзілі нам гэтую інфармацыю, але паведамілі, што будуць выходзіць на працу, як і ў звычайныя дні.

Званок ад імя студэнта ў дэканат будаўнічага факультэта пацвердзіў: заняткаў насамрэч не будзе. Аб прычынах не паведамілі. «Не будзе і ўсё». На эканамічным факультэце на пытанне адказваць не сталі, толькі імкнуліся высветліць асобу суразмоўцы. А на архітэктурным роблена абураліся: «Хто вам сказаў?»

Рэктар БДПУ Пятро Пойта з'яўляецца даверанай асобай Лукашэнкі. Ён жа ўзначальвае абласную арганізацыю «Белай Русі».

Відаць, улады не дапускаюць таго, што студэнты замест бацькоўскіх хат паедуць у выходныя ў Мінск на Плошчу.

На прэзідэнцкіх выбарах 2006 года датэрмінова галасавала да 30% выбарцаў. Для параўнання: ва Украіне і Расіі гэтая лічба ніколі не перавышала 1–2%. Як стала вядома са сведчанняў падпалкоўніка міліцыі Мікалая Казлова, датэрміновае галасаванне выкарыстоўваецца для фальсіфікацыі вынікаў народнага выяўлення волі. Казлова звольнілі пасля таго, як ён спрабаваў перашкодзіць укіду бюлетэняў у скрынку ў часе датэрміновага галасавання.

**МБ, Юрась Ускоў**

## Лукашэнка чытае «Нашу Ніву»

Аляксандр Лукашэнка на ўсебеларускім хурале звярнуў увагу на праблему, узнятую ў «Нашай Ніве». І даручыў чыноўнікам яе вырашыць.

Лукашэнка на закрыцці хурала звярнуў увагу на харчаванне дзяцей у школе. Нагадаем, што ў артыкуле «Сырок разладу» гаварылася пра тое, што рацыён школьнікаў, за харчаванне якіх плаціць дзяржава, адрозніваецца ад тых, хто сталуецца за кошт бацькоў.

Лукашэнку абурыў такі факт. «Гэта дзіка!» — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён запатрабаваў да Новага года вырашыць гэтую праблему, каб не ствараць паміж дзецьмі расслаенне ўжо са школьнай парты.

Выходзіць, Лукашэнка ці, прынамсі, ягоныя памочнікі ўважліва чытаюць «Нашу Ніву».

**Кастусь Матушыч**

**8 снежня нацыянал-бальшавікі Мінска правялі ля помніка Пушкіну пікет супраць кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Лукашэнкі. Невядомыя ў цывільным затрымалі аднаго ўдзельніка і аднаго журналіста.**




## АНТ рыхтуе народ, што за Лукашэнку напішуць 73%

А нікому з апазіцыянераў — больш за два.

Учора ўвечары на тэлеканале АНТ падчас перадачы «Контуры» прапаноўвалася ўзяць удзел у інтэрактыўным галасаванні «За каго вы будзеце галасаваць на прэзідэнцкіх выбарах?» Ніякай сістэмы кантролю за вынікамі няма. Фактычна, ва ўсіх гэтых тэлеапытаннях аўтары праграмы могуць ставіць любыя лічбы.

У гэтым сэнсе цікава, якія вынікі прэзентаваў лукашэнкаўскі тэлеканал. За дзейснага кіраўніка дзяржавы за гадзіну эфіру нібыта прагаласавала 83 тысячы гледачоў, што складае 73,2%.

А вось ніхто з апазіцыянераў не набраў больш за 2%. Цікава, што супраць усіх амаль 20%.

Дарэчы, прыкладна такія самыя лічбы называюць і праўрадавыя прапагандысты.

Эксперты кажуць, што размыванне электарату — адна з правераных тэхналогій. Такім чынам у Лукашэнкі не акажэцца выразнага праціўніка. Калі б такі выявіўся, вакол яго згуртаваўся б увесь апазіцыйны электарат.

Яшчэ цікава, што менавіта тэлеканал АНТ замовіў экзітполы ва ўкраінскай кампаніі ТНС.

**Зміцер Панкавец**

# Агітацыйны хіт: дзеці спелі пра «бацьку-прэзідэнта»

### Радыёстанцыі атрымалі загад круціць «Саня останется с нами» і «Наш президент».

Напярэдадні выбараў у беларускія радыёстанцыі разаслалі дыскі з песняй «Наш прэзідэнт». Пад празрыстую сінтэзатарную мелодыю дзіцячы голас пранікнёна выводзіць:

Смотрит в облака правды монумент,
Расскажи, огонь, о страшной битве.
В мыслях и трудах
Батька-президент:
В радостях, печали и молитвах.

На прыпеве музыка робіцца маршавай, уступае хор, памятны па піянерскіх часах:

Наш президент сказал тебе и мне:
«Ты дружбой дорожи, своей Отчизной!»
Душой и сердцем преданный стране,
Ответственный за мир, за радость в жизни —
наш президент.

Аўтарка словаў і музыкі — жыхарка Мінска Наталля Монцік, якая выкладае вакал у дзіцячай музычнай студыі «Зорачка» пры Акадэмічным ансамблі песні і танца Узброеных сілаў.

Інфармацыя пра песню абляцела незалежныя навінныя сайты і ўрэшце патрапіла ў вечаровы эфір Першага расійскага канала.

«Наш прэзідэнт», безумоўна, зрабіўся неафіцыйным гімнам лукашэнкаўскай выбарчай кампаніі, пацясніўшы песню «Саня останется с нами». Некалькі месяцаў таму праспяваная хрыпатым голасам іранічная песня гурта «Рокерджокер» аб безвыходнасці палітычнай сітуацыі ў Беларусі з'явілася ў інтэрнэце.. Аднак не ўсе зразумелі гэтую іранічнасць, і песня загучала на радыё. Хто такі Саня — да канца няясна. Мо нават сабутэльнік музыкаў. У песні, праўда, згадваюцца «чыстыя вуліцы» «самага чыстага месца на глобусе»...

У 2006-м неафіцыйным гімнам лукашэнкаўскай кампаніі быў хіт «Слухай бацьку!» ад Анатоля Ярмоленкі і «Сяброў». Ён весяліў тэкставымі алагізмамі: «Ладно сшіт і крепко сложен — он плохому не научіт...» Злыя языкі кажуць, што спадар Ярмоленка, гэтак «прагнуўшыся», хацеў выйсці з няласкі, у якую трапіў, абараняючы беларускую мову на адным з банкетаў у Драздах.

Агітка «Наш прэзідент» розніцца ад ранейшых яшчэ і тым, што ўкладзеная ў вусны дзяцей. Фактычна, непаўналетнія прыцягнутыя да палітычнай агітацыі. На сайт nn.by з нагоды з'яўлення песні прыйшло больш за 100 каментароў. «Сорам! Паўночная Карэя. Няма слоў. Не думаў, што да такога можна дажыць», — пішуць каментатары.

Толькі ленінска-сталінскія панегірычныя песні для дзіцячых хароў пісалі прафесіяналы і зацвярджалі ідэолагі, а тут узровень аматарскі — «ініцыятыва знізу». Пачуўшы, што песня пачынаецца словамі пра «мінскую вясну, якая палыхне сцягамі», некаторыя чытачы рассмяяліся. «Мінскай вясной» называлі маніфестацыі ў абарону незалежнасці і за імпічмент Лукашэнкі ў 1996-м.

**Віталь Несцераў**

### «Наш президент»

*Аўтар слоў і музыкі — Наталля Монцік*

Полыхнет теплом минская весна,
Флагами, цветами и сердцами.
И бурлит душа, праздник не спеша
Постучится и споет с друзьями.
Смотрит в облака правды монумент,
Расскажи, огонь, о страшной битве.
В мыслях и трудах
Батька-президент:
В радостях, печали и молитвах.

Прыпеў:
Наш президент сказал тебе и мне:
«Ты дружбой дорожи, своей Отчизной!»
Душой и сердцем преданный стране,
Ответственный за мир, за радость в жизни —
Наш президент.
И рассыплет трель старая гармонь,
Малыши положат в ряд тюльпаны.
К сердцу своему он прижмет ладонь
И тепло обнимет ветерана.
Там пройдут войска, аж захватит дух,
И салют над торжеством парада
Закружит пургой тополиный пух,
Что же, люди, нам для счастья надо?

Прыпеў

Беларусы, мы все — победители!
Не допустим беды и войны!
21-го века мы жители,
Мы победы наследники и надежда страны!
Наш президент…

(песню можна спампаваць на nn.by)



Песня студыі «Зорачка» «прайшла цэнзуру, усім спадабалася».

## Наталля Монцік: «Песня Лукашэнку спадабалася, раз я яшчэ здаровая…»

### Карэспандэнт «НН» высветліў у Наталлі Монцік, як яна стварыла свой агітацыйны хіт.

Наталля Монцік — жонка афіцэра, у Беларусь прыехала 15 гадоў таму. Даўно піша вайсковыя песні. Яна выкладае ў дзіцячай студыі «Зорачка» пры Акадэмічным ансамблі песні і танца Узброеных сілаў. Яе вучні і праспявалі песню.

**Наталля Монцік:** У гэтай песні ёсць дзве назвы — «Наш прэзідэнт» і «Нашчадкі перамогі». Насамрэч — гэта песня пра дзяцей, вясну і ветэранаў. Пра тое, як дзецям добра жыць у гэтай краіне пры гэтай уладзе...

**«Наша Ніва»: Калі Вы яе напісалі?**

**НМ:** Яшчэ ў 2008-м. Яе тады выканалі на вялікім урачыстым канцэрце ў Палацы рэспублікі, з відэашэрагам пра прэзідэнта на заднім плане. Песня прайшла цэнзуру, усім спадабалася. У зале былі Павел Барадзін, міністры абароны і культуры. І ўсе цудоўна паставіліся да песні. У нас шмат песень, якія ляжаць у багажы. Мы чакалі нагоду, і яна прыйшла, таму мы адправілі яе на радыёстанцыі. Песня проста дачакалася свайго зорнага часу.

**НН: Можа, Вы чулі, якая была рэакцыя Лукашэнкі?**

**НМ:** (усміхаецца) Я не ведаю, але думаю, што рэакцыя была добрай, раз я ўсё яшчэ здаровая... Але якая можа быць рэакцыя, калі пра цябе спяваюць дзеці, і спяваюць добра?! Зразумейце, я вельмі люблю нашу ўладу, хоць сама расіянка, а ў Беларусь прыехала пятнаццаць гадоў таму.

**НН: Вас моцна крытыкуюць у інтэрнэце…**

**НМ:** Нягледзячы на негатыўныя каментары на апазіцыйных сайтах, я сябе адчуваю добра. Нічога дрэннага я не зрабіла. А мне цяпер усё тэлефануюць, пытаюцца пра песню, хочуць паразмаўляць пра гэта... Але я ўсім цяпер адмаўляю.

**НН: Бацькі хаця б ведалі, што спяваюць іх дзеці?**

**НМ:** Бацькі нашых дзяцей — вельмі сур'ёзныя людзі, ніхто не быў супраць. Наадварот, яны былі ўсцешаныя.

**НН: Як вы думаеце, ваша песня застанецца ў гісторыі?**

**НМ:** Я не настолькі фанабэрыстая, каб думаць пра гэта. Я проста пішу добрыя песні. Застануцца ў гісторыі — добра, не — буду працаваць далей.

**Гутарыў ВН**

# Раманчук: Лукашэнкаўцы прапануюць мне ўзначаліць урад

### Са словаў кандыдата, яму прапануюць пасаду прэм'ера або віцэ-прэм'ера.

Як паведаміў Яраслаў Раманчук 13 снежня на прэс-канферэнцыі ў Мінску, на мінулым тыдні з такой прапановай да яго звярнуліся два супрацоўнікі Адміністрацыі прэзідэнта. Сустрэча насіла нефармальны характар.

«З выбараў мне здымацца не прапаноўвалі. Прадстаўнікі адміністрацыі паведамілі, што некаторыя мае ідэі носяць канструктыўны характар», — сказаў Раманчук.

Са словаў кандыдата ў прэзідэнты, высокія прадстаўнікі ўладнай вертыкалі прапанавалі яму пасаду кіраўніка ўрада альбо намесніка кіраўніка, адказнага за эканамічныя рэформы.

У адказ Раманчук вылучыў шэраг патрабаванняў, сярод якіх змены падыходаў у працы ўрада, большая самастойнасць у прыняцці рашэнняў, а таксама магчымасць прывесці каманду прафесіяналаў, якія б дапамагалі рабіць рэформы.

Раманчук паведаміў, што рэакцыі на ягоныя патрабаванні пакуль няма. Кандыдат на прэзідэнта не назваў журналістам імя чыноўніка, які прапанаваў яму пасаду.

Паводле Раманчука, размова з вертыкальнікам адбылася на мінулым тыдні, да таго як у суботу ён трапіў у аўтааварыю па дарозе з Гомеля ў Рагачоў. Менавіта аварыя, як кажа кандыдат на прэзідэнта, і падштурхнула яго распавесці пра гэтую прапанову.

PHOTO.BYMEDIA.NET



### «Трэба карыстацца момантам»

Ці сапраўды кандыдат у прэзідэнты ад АГП Яраслаў Раманчук гатовы працаваць ва ўрадзе? Аб гэтым мы папыталіся ў самога палітыка.

**«Наша Ніва»: Яраслаў, сапраўды гатовыя працаваць у сённяшнім урадзе?**

**Яраслаў Раманчук:** Калі мае ўмовы будуць выкананыя, то так.

**«НН»: Лічыце, што пры Лукашэнку рэальна рэалізаваць вашы праграмы?**

**ЯР:** Мы застаёмся прыхільнікамі канструктыўнага дыялогу з уладамі. Мы за рэальныя змены ў краіне, за тое, каб зрабіць яе больш адкрытай. Калі такія нашы пажаданні супадуць, то чаму б не. Але абараняць інтарэсы наменклатуры я не збіраюся.

**«НН»: А не баіцеся, што могуць Вас проста скарыстаць?**

**ЯР:** Тое самае было, калі мяне запрашалі ў камісію па краінавым маркетынгу. Гэта было рашэнне партыі — уваходзіць у яго склад. Цяпер таксама. Трэба карыстацца момантам, калі прапанова ўладаў насамрэч шчырая і адкрытая.

**Зміцер Панкавец**

**У чыноўнікаў прэзідэнцкай адміністрацыі выклікае усмешку**

заява, што супрацоўнікі Адміністрацыі прэзідэнта прапанавалі Яраславу Раманчуку пасаду прэм'ер-міністра альбо віцэ-прэм'ера па справах правядзення эканамічных рэформ і каардынацыі іх. Пра гэта «Еўрарадыё» заявіў супрацоўнік прэс-службы Адміністрацыі.

Супрацоўнік прэс-службы: «А чаму адразу не прэзідэнта? Калі б не выбары, то яму б прысніласяся, што яму пасаду прэзідэнта адразу прапанавалі?!».

# Што, Някляеў, памаглі табе твае маскалі?

Піша **Андрэй Дынько**.

АЭП падпісаны. Лукашэнка трыумфуе. Уладзімір Някляеў у той жа дзень прапанаваў апазіцыйным кандыдатам зняць свае кандыдатуры. А што ж — маскоўскія тэлеканалы абвесцяць пераможцам не яго, а Аляксандра Лукашэнку.

Кандыдаты зняцца адмовіліся.

Што дало б зняцце кандыдатаў?

Зніжэнне легітымнасці выбараў. Але для таго патрэбнае зняцце ўсіх разам, а не кагосьці асобна ўзятага.

Зняцце было б цяжка абгрунтаваць для грамадства. Чаму кандыдаты знімаюцца ва ўмовах, калі кампанія адбываецца свабадней, чым папярэднія?

Зняцце выклікала б у грамадства расчараванне. Адна рэч, калі мы галасавалі за «іншага», а выбары сфальшавалі, а другая рэч — калі «яны ўвогуле забаяліся ісці».

Зрэшты, каб кандыдаты зняліся дружна, ад пачатку патрэбнае адзінства дзеянняў, патрэбны адзіны рух і ўзаемны давер. А іх няма. Чаму няма — асобная вялікая тэма.

Заклікаючы да зняцця, Някляеў найперш хоча захаваць твар.

Разлік на дапамогу Масквы, на падман маскоўскіх тэлеканалаў быў фаўстаўскай стаўкай. Але, нагадаю, у гэтую гульню ўцягнулася меншая частка апазіцыі.

Наяўнасць ці адсутнасць кандыдатаў у выбарчых бюлетэнях мае мала розніцы. Галоўным рычагом уплыву грамадства на палітычную сітуацыю застаецца Плошча, а не бюлетэні.

На жаль, як напісаў Алесь Юркавец у Arche, «рашэнне ўзяць удзел у сёлетняй Плошчы для многіх, як і пяць ды дзесяць гадоў таму, зноў будзе дыктавацца адно толькі імкненнем захаваць самапавагу, але не надзеяй штосьці змяніць».

Але, піша ён, «нам у такіх умовах застаецца толькі чакаць вечара 19 снежня і, нягледзячы ні на што, выходзіць на Плошчу». Пагаджаюся з ім.

# Што, Дынько, памаглі табе твае амерыкосы?

Піша **Аляксандр Фядута**.

У мяне па-рознаму складаліся адносіны з газетай «Наша Ніва» і асабіста з Андрэем Васільевічам. Да газеты, якую робіць гэтая рэдакцыя, я стаўлюся з павагай. Менавіта таму ў мяне з'явілася вельмі сумнае адчуванне пасля прачытання артыкула «Што, Някляеў, дапамаглі табе твае маскалі?»

Па-першае, наважуся нагадаць Андрэю Дынько: Уладзімір Някляеў ніколі не казаў пра тое, што лёс беларусаў павінен вырашаць нехта, акрамя саміх беларусаў. У тым ліку расіяне. Глупствам было б закрыццё расійскага рынку для беларускіх тавараў, злачынствам перад сотнямі тысяч нашых суграмадзян, што жывуць за кошт супрацоўніцтва з Расіяй, — аднаўленне памежных слупоў паміж Магілёвам і Смаленскам. Пра гэта Някляеў увесь час і казаў. І кажа цяпер. Лукашэнкі прыходзяць і, спадзяюся, сыходзяць. Інтарэсы краіны і народа застаюцца. І калі сёння ў сп. Дынько ёсць альтэрнатыўныя рынкі (у тым ліку і альтэрнатыўны рынак занятасці для скарочаных у нас у краіне рабочых), раю яму прапанаваць свае паслугі Лукашэнку ў якасці віцэ-прэм'ера па пытаннях эканомікі: Кабякоў (таксама Андрэй) абтрапаўся і відавочна мышэй не ловіць.

Па-другое, нагадаю Андрэю Васільевічу: сустрэчы ў Маскве папярэднічала сустрэча ў Астане. Пасля гэтай сустрэчы амерыканскі дзяржсакратар Хілары Клінтан заявіла, што адносіны з афіцыйным Мінскам у Вашынгтона паступова нармалізуюцца. Цана нармалізацыі — 200 кілаграмаў узбагачанага ўрану, якія не сплылі да Ахмадзінеджада, чаго відавочна баяўся Вашынгтон. Таму і перашкоды на шляху будаўніцтва АЭС знятыя. І адмашка дадзеная: Крэмль, мы не пярэчым супраць таго, што вы ўрэгулюеце канфлікт з Лукашэнкам. Сукін сын — але ваш сукін сын.

Вы можаце мне запярэчыць, Андрэй. Але прачытайце заявы сп. Патоцкага, паслужліва перадрукаваныя ў «НН» №46. Вінаватыя ва ўсім, на думку «вясёлага Роджэра» — аднаго з тых, хто паслядоўна і няўхільна расколваў усе гэтыя гады беларускую апазіцыю, ставіў яе ў сітуацыю просьбіта, прымушаў кіравацца ўласнымі парадамі, якія не мелі нічога супольнага з беларускімі рэаліямі, — мы, беларусы. Ну і Някляеў, на якога сёння сп. Патоцкі — а ўслед за ім і Вы — спісвае ўсе грахі.

Якія грахі, Андрэй Васільевіч?

Тое, што Някляеў здолеў стварыць самую магутную і эфектыўную каманду? Вы ж ведаеце, сп. Дынько, колькі кандыдатаў рэальна змаглі сабраць 100 тысяч подпісаў. Гэта — грэх?

Тое, што ніхто і нікому не кажа, адкуль фінансавалася кампанія «Гавары праўду!»? Дык гэта азначае толькі адно: упершыню за многія гады ў апазіцыйнай структуры на самым версе не было стукачоў. Гэта, як я разумею, раздражняе і беларускія ўлады, і сп. Патоцкага. А за рукі спадароў Мядзведзева і Пуціна ў момант перадачы грошай Някляеву ні Вы, ні сп. Мілінкевіч, ні нават сп. Лукашэнка так і не злавілі.

Тое, што, у адрозненне ад Аляксандра Мілінкевіча, чые паплечнікі закідалі амбасады і заходніх донараў даносамі на Някляева, сам Някляеў паслядоўна і настойліва прапануе хоць неяк аб'яднаць дзеянні? Аж да зняцця — усіх, уключаючы яго самога. Гэта — «маскоўскі сцэнар»? Але ж ад Плошчы Някляеў не адмаўляецца. Наадварот — яшчэ мацней заклікае ўсіх на яе выйсці.

І гэта правільна.

Амерыканцаў купілі ўранам.

Еўрапейцаў купяць мараторыем на смяротнае пакаранне. Цаной пажыццёвай нуды чатырох забойцаў у год аплацяць свабоду дзевяці з паловай мільёнаў беларусаў.

Пра расіянаў Вы шмат сказалі. Далучацца не цягне. Тым больш што Пазняк сказаў лепш. І, як ні дзіўна, больш паважліва.

Нам нічога не засталося, акрамя Плошчы.

Плошча бывае розная.

Бывае Майдан Энтузіязму. Калі гонар за сябе, за сваю гісторыю, за свой народ, у якога крадуць перамогу, прымушае таксіста кінуць свой аўтамабіль, міліцыянта-рэгуліроўшчыка — сваё жазло, дацэнта — сваю аўдыторыю. Усе разам ідуць на Майдан. Каб абараніць перамогу.

А бывае Майдан Адчаю. Калі боль ад здрады перапаўняе цябе. Калі чуць іранічныя папрокі ты не можаш. І калі будучыні — іншай, без гэтай самай Плошчы, — у цябе няма.

Памятаеце «Палёт над гняздом зязюлі»? Чырванаскуры Правадыр вырывае там рукамыйнік, разбівае шкло і сыходзіць. Таму што галасаваннем нічога не вырашыш.

Вы верыце, што вырашым? Не? Тады пра што пісала Ваша газета гэтыя паўгода? І, галоўнае, — дзеля чаго пісала?

Я верыў і веру, што Плошча вырашыць гэтым разам усё. Ад адчаю. Я веру, што адчай, боль і сорам здольныя замяніць энтузіязм і рамантычную веру.

Студэнт Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта, хлапчук з Брэста сказаў мне: «Калі Плошчы не будзе, я эмігрую. Што тады рабіць у гэтай краіне?»

Ён і так вучыцца ў Вільні. Але ён не эмігрант. І не хоча быць эмігрантам.

Я яго разумею.

Таму цяпер заклікаю Вас, Андрэй Васільевіч. Заклікаю як чалавека, якога працягваю паважаць.

Памаўчыце.

Заткніцеся.

Гэта — наш абавязак.

Заткнуцца. Цяпер — заткнуцца.

У краіне пачынаецца датэрміновае галасаванне. І ў нас з Вамі як у людзей, што пішуць, няма іншага абавязку і іншага права, акрамя як супрацьдзейнічаць гэтаму амаральнаму, антыпатрыятычнаму, хлуслівому працэсу.

Не дзеля Някляева. Не дзеля іншых кандыдатаў. Калі хочаце — пашлём іх разам у дупу, раз ужо яны не змаглі ці не захацелі дамовіцца.

Але дзеля гэтага хлапчука з Брэста — так. Няма іншага выйсця.

А 19 снежня а 20-й я буду на Плошчы. У мяне і ў гэтым няма іншага выйсця. У 2006 годзе я працаваў у Кіеве. Праз тыдзень пасля галасавання ў Мінску ў мяне ў Кіеве былі выбары, на якіх я працаваў. Спецыяліст не мае права кінуць тых, хто яму даверыўся.

Я не змог кінуць. Не змог прыехаць. Але 19 снежня 2010 г. а 20-й гадзіне я буду на Плошчы ў цэнтры Мінска. З пачуцця адказнасці. Я паабяцаў сваім студэнтам з ЕГУ: «Убачу некага на Плошчы — залік не пастаўлю! Не смець!»

Пасмяяліся разам. Яны сказалі: вось, яшчэ да ўлады не прыйшоў, а запалохвае...

І, калі ласка, не абражайце Паэта. Ён гэтага не заслужыў.

# Розніца ў мэтах і ў метадах

У працяг дыскусіі.

Калі ў дзень падпісання дамовы пра АЭП у Маскве Някляеў заклікаў дружыну кандыдатаў зняцца з выбараў, у мяне ў галаве перафразавалася гогалеўскае, з «Тараса Бульбы»: «Што, Някляеў, памаглі табе твае маскалі?»

Аляксандр Фядута, паліттэхнолаг кампаніі «Гавары праўду» і Някляева, адказаў у тон: «Что, Дынько, помогли тебе твои америкосы?»

Ён перавёў гаворку з Расіі на Захад.

Так, кожная дзяржава прасоўвае свае інтарэсы. Пытанне ў тым, з чыімі інтарэсамі супадае наш, беларускі інтарэс.

ЕГУ, у якім спадар Фядута выкладае, фінансуецца Захадам, а не Масквой. Масква не зацікаўленая ані ў развіцці грамадзянскай супольнасці, ані ва ўмацаванні нацыянальнай ідэнтычнасці ў Беларусі, а Захад менавіта ў гэтым бачыць сваю стратэгічную задачу — у падтрымцы стварэння беларускай нацыі. Масква ж на сёння ідэальным спосабам звяржэння Лукашэнкі бачыць наменклатурны пераварот, з заменай сённяшняга кіраўніка на яшчэ больш «згаворлівага» (адсюль і ілюзорныя надзеі на бунт у часе ўсебеларускага хурала).

Клінтаніха ўключыла пункт пра дэмакратыю і правы чалавека ў дамову з Мартынавым, у якую беларускія дыпламаты надта ж прасоўвалі пункт пра падтрымку АЭС.

Ніякай дэмакратыі і правоў чалавека Расія ў дамовы пра АДКБ і АЭП не ўключае.

Высокія госці з ЕС і ЗША сустракаюцца ў часе сваіх візітаў з апазіцыяй і праваабаронцамі. Лаўроў — нічога падобнага.

Казулін спадзяваўся на Расію, але з турмы яго выцягваў Захад.

Розніца ёсць і ў метадах Захаду і Расіі ў Беларусі, і ў мэтах.

Нельга прыцягваць Расію ў якасці арбітра ўнутрыпалітычных пытанняў. Нешта падобнае здарылася ў XVIII ст. Спачатку Сапегі, пасля Радзівілы і Панятоўскі звярталіся па дапамогу да Расіі для вырашэння ўласных задач. Некаторыя з іх былі прасцячкамі, іншыя — прахадзімцамі. Фядута-гісторык (бездакорны даследчык) ведае, чым гэта скончылася, бо сам займаецца блізкім да таго перыядам.

У часе Аранжавай рэвалюцыі Кучма і Януковіч не пусцілі ў якасці арбітра Расію. Хоць гэта каштавала ім улады.

Паліттэхнолагі Някляева выдатна скарысталі нацыянальны стэрэатып: «калі гаворыць па-беларуску, значыць, наш чалавек». Але для мяне Някляеў перастаў быць сур'ёзным кандыдатам ад таго моманту, як загаварыў аб продажы заводаў Расіі.

Дзейнасць «Гавары праўду» на гэтых выбарах, па-мойму, адпавядае найперш чаканням Масквы, каб у Беларусі з'явілася прарасійская апазіцыя.

**Андрэй Дынько**



На карціне Яна Матэйкі «Рэйтан, або Упадак Польшчы», адлюстраваная сцэна, што адбылася ў трэці, вырашальны дзень працы Сойма, які легітымізаваў падзел Рэчы Паспалітай між Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй.

21 красавіка 1773 года навагрудскі шляхціц Тадэвуш Рэйтан у роспачы лёг ля дзвярэй і не пускаў удзельнікаў Сойма ў залу падпісваць дамову аб падзеле краіны.

Побач з яго постаццю выяўлены князь Адам Панінскі — платны агент расійскага пасольства, які атрымліваў 24 тысячы дукатаў у год. Узнятай рукою ён паказвае на расійскіх салдатаў у дзвярах.

Побач з ім у светлым убранні — Станіслаў Патоцкі, польскі палітык прарасійскай арыентацыі.

З левага боку высіцца самотная постаць караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага з гадзіннікам у руцэ — ад яго больш тут нічога не залежыць.

На балконе з дамамі — расійскі пасол Мікалай Рапнін. Над усёй кампазіцыяй дамінуе гіганцкі партрэт царыцы Кацярыны II.

# Аўтастопам ад Нью-Ёрка да мыса Горн. Частка 2. Мексіка

Яны прыляцелі ў Нью–Ёрк у красавіку без цэнта ў кішэні. З сабой маюць спальнікі, лекі і табурэт, які прысягнулі паставіць на мысе Горн. А яшчэ гітару, скрыпку ды трубу, з дапамогай якіх зарабляюць па дарозе. За сем месяцаў яны прайшлі–праехалі аўтаспынам і пехадралам усе ЗША, Мексіку, цэнтральнаамерыканскія Гватэмалы і Гандурасы. Цяпер яны ў Эквадоры. «Наша Ніва» публікуе захапляльныя падарожныя дзённікі Аўгіні Манцэвіч. Трое беларусаў ладзяць аўтастоп праз абедзве Амерыкі. Гэта **Кірыла Краўцоў** — капітан каманды, фатограф, трубач. Гэта **Аўгіня Манцэвіч** — журналістка, скрыпачка, акрабатка і аўтарка гэтага дзённіка. Гэта **Верасень** — аператар, гітарыст.



**Працяг. Пачатак у «НН» № 46.**

Мексіка з першага погляду ўражвае беспарадкам, шурпатасцямі, няроўнасцямі. Нават пустыня тут выглядае больш неахайна, чым у ЗША. У Хуарэсе і ваколіцах узмоцнены паліцэйскі кантроль. Дый скрозь у Мексіцы паліцыя ходзіць з заюзанымі аўтаматамі, у бронекамізэльках, правяраюць машыны на наркотыкі.

Краіна бедная, з вялікім беспрацоўем. Таму шмат хто тут займаецца продажам усякай драбязы. Прадаюць усё і ўсюды: асадкі, печыва, тэчкі, кружэлкі з музыкай. Прадаюць у метро, у пераходах, перад дзвярыма кватэраў, на святлафорах.

І пры ўсім гэтым тут нерэальна дарагая тэлефонная сувязь. Мабільнік далёка не кожны можа сабе дазволіць. Хвілінны званок з аўтамата на хатні каштуе 3 песа, на мабільны — 5 (амаль паўбакса). Мексіканец Карлас Слім, які валодае 90% тэлефоннага рынку беднай Мексікі, сёлета стаў самым багатым чалавекам свету.

Каля 35% наркатрафіку краіны праходзіць праз Хуарэс — памежны з ЗША горад. Праз яго ў Штаты правозяць вялізныя партыі какаіну, метамфетаміну і марыхуаны. Войны наркакартэляў не спыняюцца тут дзясяткі гадоў. Хуарэс займае вядучае месца ў рэйтынгу самых крымінальных гарадоў свету. Штогод тут забіваюць амаль дзве тысячы чалавек. Для параўнання, у Нью-Ёрку гэтая лічба складае 600 чалавек.

Горад Чыхуахуа (Чыўаўа ў мясцовым вымаўленні) знаходзіцца прыкладна за 300 кіламетраў ад мяжы і з'яўляецца перавалачным пунктам для перавозчыкаў наркотыкаў. Першае, што мы пабачылі пры ўездзе ў горад, — труп на зямлі, паліцыю і страшныя трушчобы.

Зайшлі мы ў «Бургеркінг» пакарыстацца бясплатным інтэрнэтам. Гляджу — Верасень раз схадзіў у жаночы туалет, другі раз. Ну, я ўжо і сказала: «Верасень, мухэр па-іспанску — жанчына». З літарай «М» — для паненак.

**Чыхуахуа**
сталіца аднайменнага мексіканскага штата з насельніцтвам 748 518 чалавек. Займае першае месца па ўзроўні злачыннасці ў Мексіцы. Перавалачная база для перавозкі наркотыкаў у ЗША.

**couchsurfing.org**
сайт, карыстальнікі якога з розных краінаў гатовыя пусціць пераначаваць вандроўніка, які апынуўся ў іх горадзе. Але і сам вандроўнік мае быць гатовы прыняць у сябе гасцей з іншай краіны.




Сацыяльная рэклама ў Мехіка: салдат знішчае куст марыхуаны.

## Кукурузнае ўсё

Прыехаўшы на вакзал, я пазваніла Герарда, хлопцу, з якім спісалася па сайце couchsurfing.org. Ён прыехаў за намі на новенькім «Шэўрале». Так мы пабачылі іншы Чыхуахуа — багаты, з высокімі платамі.

У гаражы Герарда — яшчэ два «Шэўрале».

**Аўгіня Манцэвіч**
нар. у Вілейцы ў 1985. Журналістка, блогерка, пісьменніца. Пераможца конкурсу маладых літаратараў імя Уладзіміра Караткевіча ў 2005. Аўтарка кнігі «Графіка». Жыве ў Мінску. Дачка рэдактара «Рэгіянальнай газеты» Аляксандра Манцэвіча. Сястра журналісткі і паэткі Насты Манцэвіч.

**Верасень**
Нар. у Гомелі ў 1985. Скончыў Варшаўскі ўніверсітэт, факультэт геалогіі. Захапляецца фатаграфіяй. Меў персанальную выставу ў Нью–Ёрку. Муж Аўгіні Манцэвіч.

**Кірыла Краўцоў**
Нар. у Гомелі ў 1979. Фатограф. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту, факультэт эканомікі. Дырэктар «Дызайнерскай студыі Кірылы Краўцова» ў Гомелі.




**Мексіка**
афіцыйна — Мексіканскія Злучаныя Штаты (ісп. Estados Unidos Mexicanos) — самая населеная з іспанамоўных краін (112,5 млн жыхароў). Займае 11–е месца па колькасці насельніцтва ў свеце. Плошча — 973 тыс. кв. км, у 4,5 разы большая, чым Беларусь. Сталіца — Мехіка. Беларусы ў Мексіцы ёсць, але сваёй арганізацыі не маюць.

**Мехіка**
сталіца Мексікі, 19,7 млн жыхароў, трэцяя па населенасці агламерацыя свету пасля Токіа і Сеула. Стаіць на месцы сталіцы Ацтэкскай імперыі, Тэначцітлана, зруйнаванага канкістадорамі ў 1519.




Індзейцы спускаюцца з гор у гарады па міласціну.



Дзень Незалежнасці ў Раёне. Школу вядуць на парад.




Чыстка абутку — звыклая карціна, амаль рытуал.






Двухпавярховы дом з белымі сценамі, новай мэбляй і сантэхнікай.

Бацька Герарда, Антоніа, мае выдавецкі бізнэс. Нават дарожныя знакі ў горадзе ўказваюць, дзе знаходзіцца кантора Антоніа. Герарда працуе ў быцькі ды можа сабе дазволіць падарожнічаць па свеце.

Горад аказаўся не такім страшным, як на першы погляд. Добразычлівыя мексіканцы, якія прадаюць усё і ўсюды — нацыянальныя стравы: кукурузныя бліны, кукурузны хлеб, кукурузныя чыпсы, кукурузныя катлеты, кукурузная каша, кукурузнае печыва...

З гор у Чыхуахуа спускаюцца індзейцы ў нацыянальных строях. Яны кажуць, што прыходзяць паглядзець горад. Аднак часта іх можна пабачыць з працягнутай рукой альбо пачуць ад іх: «ун песа, пор фавор».

Іспанскія каланісты ў свой час не прывезлі з сабой белых жанчынаў, таму зараз 80% мексіканцаў — метысы. Аднак многія з іх (і нават урбанізаваныя індзейцы) з пагардаю глядзяць на «нэйтыў амерыканз», якія дагэтуль вядуць традыцыйны лад жыцця.



Ацтэкскі шаман «лечыць» проста на вуліцы Мехіка.

Мексіканскі аўтастоп аказаўся мегахуткасным. Спыніўся грузавік. Кіроўца аглядае мяне з ног да галавы. Гаворыць, што гатовы ўзяць мяне адну, без Верасня.

— Но, — кажу. — Насотрас дос — нас двое.

Пасля яшчэ хвілінкі размовы такою моваю ён махае рукою: паехалі!

— Мы будзем ехаць увесь дзень і ўсю ноч, прыедзем раніцай, — тлумачыць нам Арманда. Да Мехіка каля 1600 кіламетраў.

Наш спадарожнік дастае маленькую таблетку і кажа: «Амфетамін». Так мексіканскія дальнабоі ездзяць начамі. Дарожнай паліцыі на гэта пляваць. Як пляваць і на хуткасць (мы ехалі 114 км/г), на абгоны на паваротах праз двайную суцэльную.

## Мехіка

Мехіка — трэцяя па колькасці насельніцтва агламерацыя свету пасля Токіа і Сеула і першая па нязручнасці транспартнай сістэмы. Усе дарогі (нават 12-палосныя) стаяць амаль цэлымі днямі. Пастаянныя газаванні і тармажэнні.

У мясцовых аўтобусах ёсць зазывалы, якія амаль за руку цягнуць усярэдзіну. Трэба вырывацца.

Габрыэла, якую мы знайшлі праз знаёмых, «упісала» нас да свайго сябра, які ў тыя дні выехаў за горад. Уся кватэра — у нашым распараджэнні. Кватэра — гучна сказана. Прыбудова на даху. У пакойчыку змяшчаецца ложак, маленькі столік і шафка. Ну і куча смецця.

Пасля генеральнай уборкі ў пакоі мы знайшлі гашыш, пару недакуркаў марыхуаны, цэлы джоінт [самакрутка з наркотыкамі — слэнг, Рэд.], тры пеёты, скручаную ў трубачку дваццаціпесавую купюру, гумовы чэлес і кучу парнухі.

Дарэчы, з сэксуальнай свабодай у Мексіцы няма праблемаў. Амаль у кожным горадзе, дзе мы былі, трапляюцца гей-бары, гей-дыскатэкі. А ў Мехіка за два дні да нашага прыезду гарадскія ўлады дазволілі аднаполыя шлюбы. Акрамя таго, цяпер аднаполыя пары там могуць усынаўляць дзяцей.

Увогуле, мы прыехалі ў Мехіка зрабіць візы ў астатнія краіны Лацінскай Амерыкі: Калумбію, Аргенціну, Бразілію, Балівію. Першая на нашым шляху — Калумбія. У консулаце на пытанне, колькі часу будзе рабіцца віза, адказваюць: тры дні. Здаём дакументы. Супрацоўніца разглядае іх і кажа: «Для грамадзянаў вашай краіны дакументы разглядаюцца месяц».

**Мясцовыя шаманы—ацтэкі лечаць людзей усяго за 20 песа (каля 2 баксаў).**

Нядаўна Калумбія і Венесуэла парвалі дыпламатычныя адносіны. Калумбія абвінавaціла Венесуэлу ў тым, што Чавес даў прытулак на сваёй тэрыторыі паўстанцам Рэвалюцыйных узброеных сілаў Калумбіі. Відаць, сяброўства Лукашэнкі і Чавеса і падпсавала нам паход у калумбійскую амбасаду.

Сэнсу заставацца ў Мехіка ў нас больш не было. Тым больш што горад аказаўся вельмі дарагім. І праз тыдзень мы накіраваліся ў Каацакаалькас, дзе ў нас быў прызначаны наступны фестываль.

Па горадзе развешаныя патрыятычныя плакаты. На гэтым, напрыклад, бравы салдат зніштажае кусты марыхуаны.

## Ve la Libertad (Беліберда)

Пасярод шляху ад Мехіка да Каацакаалькаса спыняецца загружаны даверху пластмасавай тарай пікап. З кабіны вылазяць два чувакі і пачынаюць вызваляць нам месца ў кузаве. Сяк-так мы туды змясціліся са сваімі заплечнікамі, інструментамі і табурэткай. Праз сто метраў кіроўца зноў спыняецца... каб падабраць кабету з яшчэ большай колькасцю багажу — вёдрамі, сумкамі... На мексіканскіх дарогах штохвіліну можна пабачыць загружаныя людзьмі пікапы. Па прынцыпе: дзе змесціцца адзін, там і дзесяць.

Як толькі мы праехалі горы, адразу трапілі ў іншы клімат — у тропікі: пальмы, фрукты, вільгаць і сезон дажджоў. Кожную ноч (а часам і дзень) нас чакаюць залевы.

А ў Каацакаалькасе нас сустрэлі ўкраінскія табурэтнікі разам з мясцовымі музыкамі. Так мы апынуліся ў рэстаранчыку, які на цэлы тыдзень падчас фестывалю, які мы арганізавалі, трапіў у нашае распараджэнне.

## Мексіканскае бездарожжа

З Каацакаалькаса мы вырашылі паехаць на паўднёвы захад, да Ціхага акіяна. Праз кіламетраў сорак сталі пад мостам. Побач — тры жанчыны з глыбокімі дэкальтэ і ў вузкіх джынсах. Раз-пораз ля іх спыняюцца грузавікі, жанчыны па адной заходзяць у кабіну, праз хвілін 15 выходзяць. А ля нас ніхто спыняцца і не думае.

Дарогу, па якой мы планавалі патрапіць у Аахаку, размылі дажджы. Мы мяняем маршрут і едзем да горада Акаюкан у прычэпе разам з канём.

А пасля нам сустрэўся загадкавы Флака дэ Ора. Так ён прадставіўся, пасмейваючыся ды выстаўляючы свой залаты зуб і пагладжваючы адною рукою залаты крыж на грудзях. Пазней мы даведаліся са слоўніка, што Флака дэ Ора — гэта штосьці кшталту «Залаты хіляк». Ён узяўся падвезці нас.

Праехалі кіламетраў сто, і перад намі раптам вырасла чарга з грузавікоў. Аб'язджаем яе — дарога перакрытая. Едзем назад. Спыняемся перад варотамі нейкага ранча.

«Ну што, — кажа наш новы сябра, — будзем начаваць тут?» «Канечне», — з радасцю згаджаемся мы. Аднак Флака дэ Ора выварочвае руль зноў на дарогу, і мы спыняемся каля варотаў наступнага ранча. Чакаем гаспадароў.

Удалечыні з'явілася святло ад фараў. Нас знаёмяць з Тоні і яго сям'ёй. Пасля некалькіх песень мы ўжо гатовыя раскладаць намёт. Аднак Флака не падабаецца ідэя правесці ноч на брудным ранча. «Паедзем дадому, — упрошвае ён нас, — там тэлевізар». Абяцае заўтра раніцай зноў рвануць з намі на поўдзень. І мы згаджаемся.

Па дарозе заехалі ў рэстаран, наш сябра накарміў нас ад пуза. І вось мы ў яго дома. А дома — два сыны 14 і 15 год і жонка 17 год на другім месяцы цяжарнасці.

Працяг на старонцы 10.

# Аўтастопам ад Нью-Ёрка да мыса Горн. Частка 2. Мексіка

Працяг са старонкі 9.

Яна па сакрэце сказала нам, што яе мужа завуць Элісеа. Той, дазнаўшыся, учыніў скандал.

Назаўтра а сёмай мы гатовыя выязджаць. Але Элісеа не спяшаецца. З яго спальні нічога не чуваць. Прыйшла служанка. Пачала прыбіраць кватэру, праць бялізну. Накарміла нас сняданкам. У 11 прачнуўся Флака. Высунуўшы нос з-пад коўдры, паведаміў нам, што праезд закрыты да чатырох гадзінаў дня.

Дарогу перакрылі мясцовыя сяляне і кіроўцы грузавікоў, якія патрабавалі ад уладаў пабудаваць мост паміж двума мястэчкамі.

На наступную раніцу Флака нам зноў паведаміў, што дарога перакрытая, як і ўсе астатнія, якія вядуць з Акаюкана ў які-кольвек бок. Навіны страшылі кадрамі паводак, якія размывалі ўсе дарогі на поўдні Мексікі...

Што рабіць? Не заставацца ж жыць у Акаюкане, хоць нас тут і кормяць, і пояць, і спаць кладуць. Вырашылі выбірацца на Юкатан любымі спосабамі.

На развітанне Элісеа так падабрэў, што не толькі даў сфатаграфавацца з усімі членамі сям'і, але і рассакрэціў сваё прозвішча і сказаў, што трымае рэстаран.

## Юкатан

Спыніліся дзве бельгійкі, якія прыляцелі ў Мексіку на два тыдні, знялі машыну за 600 еўра і ездзяць на ёй па краіне. З імі мы і даехалі да горада Вілахермоса.

Ідзём у роздумах, дзе б пераначаваць. Гляджу — Верасень перамаўляецца жэстамі з будаўнікамі. І праз дзесяць хвілінаў мы ўжо спяваем перад мексіканскімі рабочымі, потым ставім намёт на будоўлі.

Сонца ўстала — будаўнікі бяруцца за працу, а мы ідзём на дарогу, каб ехаць у Паленке — старажытны горад, былую сталіцу індзейцаў мая. Тут сярод прыгожых вадападаў і дзікіх джунгляў захаваліся піраміды індзейскай цывілізацыі мая.

Піраміды былі пабудаваныя для ахвярапрынашэнняў, у тым ліку — чалавечых. Таксама з іх вяршыняў старажытныя індзейцы назіралі за нябеснымі свяціламі.

Менавіта ў Паленке знаходзіцца піраміда надпісаў. У 1949 годзе археолагі знайшлі ў яе падлозе сакрэтны люк, праз які можна было трапіць углыб піраміды. Там быў каменны саркафаг, накрыты пяцітоннай крышкай. Многія вучоныя лічаць, што на ёй выбіты чалавек, які кіруе касмічным караблём.

Лічыцца, што пірамідам каля трох тысячаў гадоў. Іх дасканаласць выклікае захапленне. Дагэтуль вучоныя спрачаюцца, ці то мая былі такой высокаразвітай цывілізацыяй, ці то ім памагалі іншапланетнікі.

З Мерыды на паўвостраве Юкатан мы вырашылі ехаць на востраў жанчынаў (Isla Mujeres). Дарогі ў Мексіцы дзеляцца на дзве катэгорыі: платныя і бясплатныя. Платныя — шырокія і простыя, аднак амаль кожная з іх дублюецца бясплатнай, больш вузкай і не такой бліскай. Нашыя спадарожнікі высадзілі нас пасярод маленькай бясплатнай дарогі, упэўніўшы, што тут аўтаспын вельмі хуткі.

Калі пачало цямнець і мы амаль згубілі надзею дабрацца да Ісла Мухэрэс, ля нас спынілася машына. Мануэль ехаў у Тулум, аднак да павароту пару дзясяткаў кіламетраў згадзіўся правезці.

Едзем, размаўляем. Бачу — паварот на Тулум. «Нічога, — адказвае Мануэль, — павярну на наступным». Так і не звярнуў да самага порта ў Канкуне, адкуль мы на пароме і накіраваліся ў рай — Ісла Мухэрэс.

## Востраў жанчынаў

Ісла Мухэрэс — рай на зямлі. Як толькі мы падплылі да вострава, адразу перасталі шкадаваць пра патрачаныя на паром 140 песа (каля 12 баксаў). Востраў — 10 кіламетраў на паўтара. У які бок ні пойдзеш — уткнешся ў мора. Мора — празрыстае і блакітнае, пляж не з пяску, а з дробнага планктону. Вакол — вялізныя ракавінкі, акамянелыя марскія зоркі...

Зіна, якая пагадзілася прыняць нас у сваім доме, аказалася родам з ЗША, а бацькі яе прыехалі з Расіі і Літвы. Бацька прымушаў Зіну вучыць расейскую мову, здаваць яму ж іспыт па «Вайне і міру». А пасля нашага візіту Зіна яшчэ даведалася, што такое развіртуалізацыя, фрэнды, боты, а таксама што слова «ўборная» ўжо амаль ніхто не ўжывае.

Зіна адпрацавала журналісткай трыццаць гадоў, атрымала бацькаву спадчыну, шэсць гадоў назад купіла два дамы на Ісла Мухэрэс. У адным жыве сама, другі — здае.

На востраве жыве каля шасці тысячаў чалавек. Асноўны транспарт тут — матаролеры і машынкі для гольфа. І таксі, якое падбірае пасажыраў па ўсім востраве і развозіць іх вельмі танна.

Тут дзеці гуляюць у футбол на дарогах, у траве хаваюцца сапраўдныя ігуаны, у вадзе плаваюць здаравенныя зялёныя рыбы з чырвоным хвастамі, скаты, па беразе поўзаюць крабы.

## Экстрэмальныя начоўкі працягваюцца

«У гаўне ды не ў крыўдзе» часам даводзіцца ездзіць па Мексіцы. І ніколі не ведаеш, дзе апынешся.

Так, адным вечарам нас высадзілі ў вёсачцы пад назвай Шпухіль (Xpujil). Ідзём у канец мястэчка, каб стопіць і бачым знак — руіны мая. За плотам сядзіць ахоўнік.

Слова за слова, і ён, пакуль ніхто не бачыць, прапускае нас ва ўжо зачыненыя для грамадскасці піраміды. Просім дазволу паставіць ля пірамідаў намёт на ноч. Без усякіх пытанняў згаджаецца.

А рана раніцай мы застопілі фуру, якая ехала да Вілахермосы, ад якой (як нам паказвала карта) дарога паварочвае на Сан-Крыстобаль-дэ-лас-Касас.



Сапатысты. Ці адзін з іх — субкамандантэ?

**Субкамандантэ інсургентэ Маркас**
(літаральна — намеснік начальніка паўстання Маркас). Левы радыкальны пісьменнік і філосаф, ідэолаг руху сапатыстаў, які ўзняў паўстанне ў штаце Чапас у 1994. Жывая ікона антыглабалізму. На людзях з'яўляецца толькі ў чорнай масцы. Лічыцца, што сапраўднае яго імя — Рафаэль Себасцьян Гільен Вісэнтэ (нар. у 1957), прафесар філасофіі. Сам Маркас гэта адмаўляе.

Страшэнны горны серпанцін, дарога віхляе кожныя 15 метраў, над намі звісаюць скалы ў густых джунглях. Знізу, пад хмарамі, віднеюцца вёсачкі.

У цэмры мы ляцім з хуткасцю за 100 кіламетраў у гадзіну і рэзка тармозім кожны раз, як з-за павароту з'яўляюцца фары сустрэчных машынаў.

Амаль ноччу прыехалі ў мястэчка Раён. На галоўнай плошчы — святкаванні. 15 верасня, мексіканцы пачынаюць адзначаць Дзень Незалежнасці.

Але мы стомленыя, нам не да гулянняў. Падрэ дазволіў нам паставіць намёт на тэрыторыі царквы. І мы тут жа пад гукі гітараў і марымбы заснулі.

## Дзень Незалежнасці Мексікі

Сёлета мексіканцы адзначылі двухсотгадовы юбілей незалежнасці. Адным з галоўных ідэолагаў барацьбы за незалежнасць мясцовых індзейцаў і метысаў быў айцец Мігель Ідальга з мястэчка Далорэс. 16 верасня 1810 года ён зазваніў у царкоўны звон, заклікаючы жыхароў Мексікі да паўстання. Менш чым праз год ён быў пакараны інквізітарамі. Барацьба за незалежнасць цягнулася 11 гадоў і скончылася перамогай мексіканцаў.

Сёння той Звон свабоды ўсталяваны на даху Нацыянальнага палаца ў Мехіка. І штогод 16 верасня звоніць.

## Таямнічыя маскі сапатыстаў

А мы працягнулі шлях у Сан-Крыстабаль. Урэшце звярнулі на дарогу, якая не мае нумара і не існуе на мапах.

У тым рэгіёне — штаце Чапас — кантроль над сітуацыяй трымаюць сапатысты — нацыянальна-вызваленчы рух Мексікі. Рэвалюцыя тут не спынеяцца. Бедныя індзейцы патрабуюць канстытуцыйнага замацавання правоў карэнных народаў Мексікі.



**«Падпольны мільянер» Элісеа з 17-гадовай жонкай.**

У 1994 годзе сапатысты пачалі ўзброенае паўстанне. Без адзінага стрэлу яны занялі некалькі муніцыпальных цэнтраў штата Чапас. Аднак праз дзень сышлі ў горы пад націскам федэральных войскаў і бамбёжкі сельвы. Падпісанае пазней пагадненне з уладамі так і засталося на паперы. І сапатысты працягваюць змаганне, ужо без зброі.

У 2001 годзе лідар сапатыстаў субкамандантэ Маркас ачоліў мірны паход на Мехіка. Тады яго падтрымалі Габрыэль Гарсія Маркес, Олівер Стоўн ды іншыя.

Асоба субкамандантэ дагэтуль укрытая таямніцаю. Ён носіць на твары маску. Едучы праз сапатысцкія вёскі, мы бачылі шматлікія рэзідэнцыі Маркаса, дзе ён хаваецца ад грамадскасці і ўладаў. Пры гэтым усе гарады знаходзяцца пад пільным кантролем дзяржаўных войскаў, усюды стаяць узброеныя пасты.

А ў вёсках — спакойнае жыццё. Жанчыны ў традыцыйных сукенках полюць агароды.

**Паводле euroradio.by**



**Паленке**
руіны Лакам–ха — старажытнай сталіцы Баакульскага царства мая (III—VIII стст.). Разбураны задоўга да з'яўлення еўрапейцаў, у IX ст. Захаваліся руіны палацаў, а таксама піраміды, якія маюць умоўныя назвы: «Храм Сонца», «Храм Крыжа» і «Храм надпісаў». У апошнім — старажытнае пахаванне ўладара Лакам–ха.

Працяг будзе.

# Топ-3 «новых вытворчасцяў» Лукашэнкі



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Завод «Бако Бісаў», вытворчасць кальцавых і стужкавых пілаў, у СЭЗ «Мінск» адкрываў віцэ-прэм'ер Кабякоў. 22 верасня 2010.**

### Якія заводы пабудавала дзяржава з 1994 года?

«Колькі вялікіх заводаў, пабудаваных дзяржавай у час кіравання Лукашэнкі, вы можаце ўзгадаць?» — задаюць рытарычнае пытанне выбарцам кандыдаты ў прэзідэнты. У залах, дзе праходзяць сустрэчы, павісае маўчанне. Прыгадваюць хіба што завод газетнай паперы ў Шклове, на радзіме Лукашэнкі, і... усё. На гэтым спіс дасягненняў вычэрпваецца.

## Усё за часамі Лукашэнкі — Лукашэнкава

Але афіцыйная прапаганда нязгодная — створаныя сотні і сотні вытворчасцяў! «Па ўсёй краіне ў свабодных эканамічных зонах працуе 318 прадпрыемстваў. Дапускаю, пра гэты факт не ведаюць некаторыя апазіцыйныя кандыдаты ў прэзідэнты. Кажу пра тых, хто заяўляе з экрана, што за гады прэзідэнцтва А.Лукашэнкі не з'явілася ніводнай новай вытворчасці. Страшна далёкія, на жаль, нашыя крытыкі ўлады ад рэальнага сектара эканомікі», — з дакорам піша адзін з аглядальнікаў «Советской Белорусіі».

Ён тлумачыць, што свабодныя эканамічныя зоны ўзніклі ўжо ў перыяд прэзідэнцтва Лукашэнкі. Як вынік, усе створаныя вытворчасці газета адносіць на рахунак дзейснага кіраўніка дзяржавы.

Гаворка вядзецца пра прадпрыемствы, пабудаваныя замежнікамі, на замежны капітал. Прыводзяцца тры прыклады: беларуска-кіпрскія «АлюмінТэхна» і «Алютэх Інкарпарайтэд» ды шведскі «Бако Бісаў», закладзены, дарэчы, яшчэ ў 1991 годзе па замове тагачаснага Мінстанкапрама. Узнікае лагічнае пытанне, прычым тут Лукашэнка?

Што да «Алюмініевых тэхналогій», якія дзейнічаюць у свабоднай зоне «Мінск» у Шабанах, то гэта сапраўды вельмі паспяховае прадпрыемства. Яго абарот сёлета можа дасягнуць нават 350 млн еўра, тады як у 2003 годзе складаў усяго каля 30 млн. Але ягоныя ўласнікі прынцыпова не бралі нічога ад дзяржавы, каб ад яе пасля не залежаць.

## Тры наскраблі

«Наша Ніва» паспрабавала скласці спіс найлепшых вытворчасцяў, створаных беларускай дзяржавай з 1994 года. Што цалкам новага атрымала краіна? Мы не разглядалі новыя лініі і цэхі, створаныя на ўжо існуючых прадпрыемствах, — толькі створаныя з нуля вытворчасці

**1. Шклоўскі завод газетнай паперы.** На бязрыб'і лідарам можа стаць і такі варыянт. Шклоўская гісторыя, пра якую мала хто цяпер ўзгадвае без смеху, мусіла стаць адным з доказаў аднаўлення айчыннай прамысловасці і замясціць імпарт газетнай паперы ў Беларусь. Не стала і не замясціла. Завод пачалі будаваць у 2005 годзе, скончылі ў 2008-ым, але дагэтуль не ўдаецца вывесці на праектную магутнасць. Спачатку была вінаватая гідраўліка, затым паляцела электраабсталяванне...

У канцы кожнага года — гэты не стаў выключэннем — спецыялісты завода абяцаюць нарэшце выйсці на запланаваныя магутнасці. Гэта тры тысячы тон газетнай паперы штомесяц. Шклоўскую прадукцыю выкарыстоўваюць большасць дзяржаўных СМІ Беларусі, апроч «Советской Белоруссіі» і «Звязды», якія карыстаюцца больш якаснымі імпартаванымі аналагамі. Кажуць, што лёгкая крэйдаваная папера пачне выпускацца ў пачатку новага года.

Кажуць таксама, што Дом друку купляць шклоўскую паперу абавязалі. Хоць каштуе яна даражэй, а па якасці саступае замежным аналагам.

**2. Вытворчасць грузавікоў і трактароў МАЗа ў Венесуэле.** Як ні смешна гучыць, другое месца займае прадпрыемства, якое яшчэ не працуе — іншых зусім няма!

Пахвалім кіраўніцтва дзяржавы за спробы ахапіць паўднёваамерыканскі рынак, але заўважым, што кантракт трымаецца на чэсным слове прэзідэнта Венесуэлы Уга Чавеса. Калі ён сыдзе ў адстаўку, ніхто не гарантуе, што вытворчасць МАЗаў спатрэбіцца краіне. Прадпрыемствы мусяць быць пабудаваныя да 2012 года ў прамысловай зоне Санта-Інэс. Планаваная вытворчасць МАЗаў складзе 5 тысяч адзінак у год, а трактароў «Беларус» — 10 тысяч.

**3. Цэгла ў Гаўрэнас-Гуатырэ.** Інфармацыя з разраду той, якой даводзіцца верыць ці не верыць на слова. Паводле паведамленняў БЕЛТА, «Белзамежбуд» вядзе ў Венесуэле будаўніцтва завода будаўнічых матэрыялаў магутнасцю 25 мільёнаў адзінак цэглы штогод. Ці даведзена будаўніцтва да канца, не паведамляецца.

## Ні рынкавай, ні планавай

Пры ўсім жаданні нам не ўдалося знайсці іншых заводаў, створаных пры ўдзеле дзяржавы. Сімвалічна і тое, што з трох праектаў рэалізаваны толькі адзін — і той праз пень-калоду.

У краінах, дзе прыватная ўласнасць дамінуе, дзяржава не займаецца пабудовай прадпрыемстваў. А вось у беларускіх умовах атрымліваецца недарэчная сітуацыя. Дзяржава кантралюе буйную прамысловасць вельмі шчыльна. Замежнікі не могуць пабудаваць вялікае прадпрыемства — хаця б той самы цэментавы завод, размовы пра які вядуцца не першы год. У дзяржавы ж, у сваю чаргу, банальна няма грошай на новыя прамасловыя магутнасці. Дый шклоўскі досвед, здаецца, надоўга адбіў жаданне ва ўладаў абяцаць анансаваць новыя «будоўлі стагоддзя».

**Яўген Васількоў**

**«Бако Бісаў»**

адзіны вытворца біметалічных стужкавых і кальцавых піл на тэрыторыі СНД. Уваходзіць у структуру міжнароднай карпарацыі Snap−On Inc. (ЗША), сусветнага лідара ў вытворчасці ручнога інструмента для авіяцыі, аўтамабільнай, будаўнічай, машынабудаўнічай галінаў. На будаўніцтва завода прыцягнута $23 млн інвестыцый. Адкрыты ў верасні 2010.

**«Алютэх Інкарпарайтэд»**

прадпрыемства па вытворчасці складнікаў для ралетных сістэм, заснаванае ў 1998. Уваходзіць у групу кампаній «Алютэх», якая займаецца алюмініевай вытворчасцю. Працуе ў Беларусі, Расіі і Украіне.

# Дзяржава ўсё ж верне ўклады?

### Лукашэнка зноў абяцае пачаць выплаты праз некалькі гадоў.

Улада адрэагавала на заявы кандыдатаў у прэзідэнты пра тое, што яны збіраюцца вяртаць савецкія ўклады і гатовыя патраціць на гэта частку грошай ад прыватызацыі.

«У наступным годзе будзе распрацоўвацца механізм кампенсавання ўкладаў Ашчадбанка СССР, зробленых да пачатку 1990-х гадоў, — заявіў начальнік упраўлення інфармацыі Нацбанка Анатоль Драздоў. — Аднак самі выплаты пачнуцца пазней, бо для гэтага трэба закласці сродкі ў бюджэт». Па папярэдніх прагнозах, агульная сума складзе больш за $2 мільярды.

У наступным годзе спецыялісты павінны дакладна палічыць, колькі цяпер каштуе адзін савецкі рубель. Першая спроба выплаты ўкладаў адбылася ў 1998—1999 гадах, калі за 10 тысяч рублёў выдавалі $500. Потым выплаты паменшыліся да $22 і людзі проста перасталі за імі звяртацца.

Уклады, паводле словаў кіраўніка Нацбанка Пятра Пракаповіча, плануецца вярнуць поўнасцю з улікам інфляцыі і ўсіх працэнтаў за мінулыя гады. «Не хвалюйцеся, нічога не знікне: у краіне вядзецца поўны ўлік усіх укладаў Ашчадбанка. Мы ўсё адсочваем», — запэўніў ён. Чаму не ўдалося вярнуць грошы раней? Пракаповіч наракае на складаныя эканамічныя ўмовы: «У першыя гады існавання Беларусі мы страцілі прыкладна 40% ВУП, і нам спатрэбілася 8 гадоў для таго, каб аднавіць эканоміку. У гэтай пяцігодцы пачалі працаваць нармальна, і раптам адбыўся новы крызіс. Мы падышлі да пытання кампенсавання «савецкіх» укладаў ушчыльную, але ён зноў перакрэсліў гэтыя планы».

**ЯВ**

## Пракаповіч загаварыў пра дэнамінацыю

### праз 2—3 гады.

Старшыня праўлення Нацбанка Пётр Пракаповіч заявіў пра магчымасць правядзення дэнамінацыі праз 2—3 гады. «У некаторым сэнсе ўжо час яе правесці, — мяркуе банкір. — Але трэба будзе рыхтавацца як мінімум на працягу паўгода. Таму дэнамінацыі праз 20 дзён не можа быць нават тэарэтычна, не кажучы нават пра практычны бок пытання». Па інфармацыі «НН», у краіне наўмысна абмяжоўваецца абарот купюр вартасцю 10 і 20 рублёў. Апошняя дэнамінацыя ў гісторыі Беларусі адбылася 1 студзеня 2000 года. Грошы мяняліся ў прапорцыі 1:1000.

**ЯВ**

## КамАЗ нацэльваецца на МАЗ?

Расійская дзяржаўная карпарацыя «Растэхналогіі» некалькі тыдняў таму пачала перамовы пра куплю беларускага МАЗа. З такой заявай выступіў Сяргей Кагогін, гендырэктар КаМАЗа. Кампанія можа быць набыта ў інтарэсах КаМАЗа, які зможа пастаўляць МАЗу аўтакампаненты — рухавікі, каробкі перадач, масты. Гэта дазволіць акупіць інвестыцыі, зробленыя ў стварэнне вытворчасці гэтых кампанентаў.

Па словах Кагогіна, кампаніі неабходны або кантрольны пакет, або 100% акцый, якія цяпер належаць Беларусі.

За некалькі дзён да гэтага прыярытэтным лічыўся венесуэльскі варыянт. Прэзідэнт гэтай краіны Уга Чавес быў гатовы купіць 25% акцый МАЗа. Генеральны дырэктар завода Аляксандр Бароўскі паведамляў, што прадпрыемства вырашае пытанне аб прыцягненні незалежнай ацэначнай кампаніі для ацэнкі МАЗа. Апроч таго, мяркуецца рэалізаваць на фінансавым рынку 8—10% акцый, каб знайсці сродкі на мадэрнізацыю.

**ЯВ**

## Сцісла

• **За снежань золатавалютныя рэзервы скараціліся яшчэ на $143 мільёны.** На 1 снежня яны склалі $5,7 мільярда. Гэта ўсяго на $53 мільёны больш, чым у пачатку года, нягледзячы на імклівы рост замежнай запазычанасці Беларусі. Дэфіцыт бягучага рахунку Беларусі можа дасягнуць у 2010 годзе 14% ад валавога ўнутранага прадукта.

• **Снапкоў: «Створым мільён працоўных месцаў!»** Міністр эканомікі Беларусі падчас выступу на хурале паабяцаў прысутным рост колькасці работнікаў у краіне. Ужо ў 2011 годзе іх стане больш на 160 тысяч, агулам за пяцігодку — на мільён. Цікава, што з такім самым лозунгам выступае апазіцыйны кандыдат Яраслаў Раманчук.

• **МТЗ, БМЗ і «Гомсельмаш» не прыватызуюць.** Прадпрыемствы выкрасленыя са спісу прапаноў для замежных купцоў.

• **Куба можа абвясціць сябе банкрутам.** Паводле інфармацыі сайта WikiLeaks, яшчэ ў лютым 2010 года італьянскія дыпламаты папярэджвалі, што Куба не ў стане абслугоўваць свой замежны доўг, які дасягнуў $17,8 мільярда. Адзіны сродак выратавання для краіны — дапамога Венесуэлы, якая штодзень пастаўляе на Кубу 90 тысяч барэляў нафты.

**ЯВ**

# Як Ян з Вільні дацкага караля абакраў

Беларусы пачуваліся ў Еўропе XVI ст. утульна. Некаторыя нават рабіліся трансгранічнымі злачынцамі. Піша **Кірыла Карлюк**.



**Майстэрня ювеліра. Гравюра Э. Дэлона, 1576 г.**

XVI — першая палова XVII ст. былі часам росквіту ў Балтыйскім рэгіёне, у тым ліку і ў Вялікім Княстве Літоўскім. Да гэтага ўздыму спрычыніліся гандаль збожжам, лёнам, каноплямі, скурамі, воскам, тлушчам, смалой, які ішоў праз буйныя парты Данцыга, Кёнігсберга, Рыгі, і стварэнне буйных рамесных цэнтраў. У Вільні, Коўне, Гродне, Полацку, Наваградку, Менску працавалі сотні адмыслоўцаў.

Адным з вядучых кірункаў была апрацоўка металаў, у тым ліку каштоўных. Ювелірнае майстэрства, або *злотніцтва*, арыентавалася на вытворчасць ювелірных вырабаў для вялікакняскага двара і арыстакратыі, каталіцкай і праваслаўнай цэркваў.

Адзін з такіх майстроў, злотнік Ян з Вільні, зрабіў кар'еру пры дварах уладароў Паўночнай Еўропы. Але грошы закружылі яму галаву.

Пра ранні «літоўскі» перыяд яго жыцця вядома мала. У дацкіх крыніцах ён згадваецца як Юхан з Вільні або Ганс *Віленскі*. Асноўная маса гэтых дакументаў пісаная на ніжнесаксонскай мове або лаціне. Першая была не толькі моваю дацкага каралеўскага двара, але і *lingua franca* ганзейскай Балтыкі. На ёй размаўлялі ў спадчынных землях Дацкай кароны — герцагствах Шлезвіг і Гальштэйн, багатых партовых гарадах, ёй шырока карысталіся нават у Вільні, Коўне, Полацку.

Цяжка сказаць дакладна, ці быў ён русінам або літоўцам, зважаючы на значную долю першых сярод тагачасных віленскіх рамеснікаў. Але ён дакладна не быў немцам. У гэтым разе такіх разыходжанняў як *Johann* або *Hans* у яго імені ў нямецкамоўных крыніцах быць не магло б. Верагодна, яго хрысцілі як *Яна*, а ў замежных дакументах ён фігураваў у залежнасці ад абставінаў і інтэрпрэтацыі сакратароў.

Пошук заробку прывёў Яна з Вільні ў 1562 г. у сталіцу Дацка-Нарвежскага каралеўства. Нездарма яго прыцягнуў менавіта двор караля Фрэдэрыка II. Данія ў сярэдзіне XVI ст. яшчэ была самым моцным гаспадарствам Балта-Скандынаўскага рэгіёна. Уладанні дацкага караля сягалі Ісландыі на захадзе і выспаў Готланд і Эзель (Саарэмаа) на ўсходзе, самага паўночнага пункта Еўропы — нарвежскага мыса Нордкап і заможных нямецкіх герцагстваў Шлезвіг і Гальштэйн на поўдні.

Над Зундскім пралівам, адзінай паўзачыненай брамай Балтыкі, высіўся праслаўлены ў шэкспіраўскім «Гамлеце» замак Кронбарг, які хутка (у 1580-я) будзе перабудаваны ў шыкоўную рэнесансную рэзідэнцыю.

У той год, калі віленскі злотнік прыбыў у Капенгаген, толькі адзін знакаміты «зундскі падатак», які сплочвалі ўсе караблі, што праходзілі праз праліў, даў дацкай каралеўскай скарбніцы больш за 67 000 далераў прыбытку...

Такія грошы давалі Фрэдэрыку II магчымасць стаць адным з самых шчодрых мецэнатаў мастацтва. Відаць, майстэрства Яна з Вільні прывабіла караля, і той 3 жніўня 1562 г. зрабіў Яна прыдворным ювелірам з гадавым заробкам 100 далераў. Неўзабаве наш віленчук апынуўся ў віхуры бурлівых падзей Сямігадовай паўночнай вайны паміж Даніяй і Швецыяй.

Швецыя зусім нядаўна стала незалежным каралеўствам пад кіраўніцтвам дынастыі Вазаў і ўжо пачала аспрэчваць першынство сваёй колішняй гаспадыні Даніі. Геапалітычнае процістаянне ў Лівоніі, дацкія прэтэнзіі на Эстонію, нават пытанні геральдычныя і дынастычныя — клубок гэтых праблем прывёў да канфлікту. 21 ліпеня 1563 г. кароль Фрэдэрык II выдаў дэкларацыю пра абвяшчэнне вайны шведскаму «ўзурпатару» Эрыку XIV. На баку Даніі выступілі ганзейскія гарады на чале з Любекам, а таксама Польшча і Літва.

Тагачасныя войскі еўрапейскіх краінаў складаліся ў асноўным з наймітаў (немцаў, швейцарцаў, валонаў, шатландцаў і г.д.), што каштавала вялікіх грошай. Дацкі кароль аддае загад неадкладна біць срэбныя і залатыя манеты з запасаў каралеўскай скарбніцы, каб плаціць салдатам. Паколькі часу на аздобу не ставала, грошы біліся ў выглядзе квадратных кліпаў. Біццё залатой манеты было даручана каралеўскаму ювеліру Яну.

У прысутнасці каменданта Капенгагенскага замка Могенса Юленшэрны, канцлера Юхана Фрыса і рэнтмайстра Юхума Бека з каралеўскай скарбніцы Ян атрымаў 233 маркі золата для біцця вугорскага *гульдэна* (залатога), 67,5 маркі для біцця залатой кроны і больш за 30 марак для біцця «рэйнскіх» залатых. Вугорскі гульдэн мусіў важыць 3,49 г, залатая крона — 3,34 г, а рэйнскі гульдэн — 3,25 г.

## Гульдэны Яна з Вільні сёння каштуюць на аўкцыёнах па пяць тысяч еўра.

У другой палове 1563 г. штэмпелем віленскага злотніка было выбіта 15504 вугорскія гульдэны, 4860 залатых крон і 2259 рэйнскіх гульдэнаў.

Выгляд першай манеты — вугорскага залатога — вызначыў сам майстар Ян. На аверсе была змешчана манаграма караля — каранаваная літара *F* і дата біцця; на другім баку — выява *Фартуны* з ветразем як пэўнага кшталту пажаданне поспеху для караля ў яго вайсковых пачынаннях.

Такая выява Фартуны, паўапранутай на антычны манер і балансуючай на шары, была тыповай для паўночнага Рэнесансу, яе можна сустрэць у Альбрэхта Дзюрэра, фламандскіх мастакоў. Выява Фартуны з ветразем прыжылася на дацкіх грошах: яна з'яўлялася на буйных наміналах у часы панавання знакамітага караля Хрысціяна IV (кіраваў у 1588—1648 гг.), сына Фрэдэрыка II.

Нягледзячы на грубаваты выгляд манеты, якая выраблялася хутка ва ўмовах ваеннай неабходнасці, сам штэмпель зроблены проста бліскуча: рэнесансная рамка вакол каралеўскай манаграмы, майстэрская выява Фартуны. Ян прайшоў добрую практыку дома: у гэты час у Віленскай менніцы біліся самыя розныя наміналы і працавалі такія выдатныя майстры, як Пётр Платын.

Сваёй працай Ян заслужыў давер караля. І 25 жніўня 1569 г. яму была дручаная новая місія. Фрэдэрык II надумаўся ўвекавечыць памяць пра свайго бацьку, караля Хрысціяна III. Згодна з традыцыяй манархаў эпохі Адраджэння, стварыць мармуровую эпітафію на месцы яго пахавання ў Роскіле. Ян атрымаў са скарбніцы шчодрую суму грошай. За іх яму належала наняць выбітнага фламандскага скульптара Карнэліса Фларыса дэ Врында.

Аднак спакуса аказалася занадта моцнай. А мо дацкі кароль чым пакрыўдзіў віленскага майстра... Словам, Ян пакінуў грошы сабе і збег у Прусію, дзе неўзабаве стаў прыдворным ювелірам герцага Альбрэхта Фрыдрыха Гагенцолерна і адкрыў прыватную майстэрню. Відаць, на грошы, скрадзеныя з дацкай скарбніцы.

Кароль Фрэдэрык неаднаразова выстаўляў прэтэнзіі, але пратэкцыя прускага герцага бараніла Яна. Віленскі майстар і авантурыст дажыў да старасці ў Кёнігсбергу, дзе і памёр у 1585 г.

Беларускія і літоўскія музеі сёння не маюць ніводнай залатой манеты, выбітай віленскім ювелірам Янам у Даніі. Іх кошт на еўрапейскіх аўкцыёнах дасягае пяці тысяч еўра.

Ян быў не першым літвінам у Капенгагене. Яго шлях па дварах балтыйскіх уладароў — толькі без крымінальнага складніка — першым прайшоў Францішак Скарына. У 1510-я ён працаваў сакратаром дацкага караля Ганса, а ў 1530 г. — быў прыдворным доктарам у прускага герцага ў Кёнігсбергу.

Як бачым, літвіны пачуваліся ўтульна ў тым інтэграваным арганізме, якім быў тагачасны балтыйскі рэгіён.


**Дацкі «вугорскі» гульдэн 1563 г., штэмпель Яна з Вільні. Беларускія і літоўскія музеі дасюль не маюць ніводнай з залатых манетаў, выбітых віленскім ювелірам Янам у Даніі.**


**Кірыла Карлюк**

нар. у 1984 у Мінску. Магістр гісторыі. Дактарант Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта (Вільня). Займаецца гісторыяй краін паўночна–ўсходняй Еўропы.


**Капенгаген у другой палове XVI ст. Гравюра з атласа Браўна і Хогенберга (4 том, 1588 г.).**



**Фрэдэрык II, кароль Даніі і Нарвегіі. Гравюра 1582 г.**

# CNN: Вёска Пагост — у Топ-10 месцаў свету, дзе можна сустрэць Новы год

Старшыня пагостаўскага сельсавета: «Бабка прыкалолася».

Аўтары штомесячнай праграмы CNN Go склалі Топ-10 найлепшых месцаў для сустрэчы Калядаў і Новага года. У кампаніі з Лонданам, Нью-Ёркам і Ганконгам у рэйтынгу нечакана апынулася і беларуская вёска Пагост.

Больш за тое, яна займае ў хіт-парадзе трэці радок.

«Імаверна, што замежным турыстам будзе цяжка трапіць у Беларусь, аднак недаступнасць краіны кампенсуецца шакуючымі каляднымі традыцыямі», — з такога сцверджання пачынае прадстаўляць нашу краіну аўтар рэйтынгу Ціфані Лэн і працягвае: «Уся сутнасць беларускай святочнай пары заключана ў Калядах — народным абрадзе, які пачаўся з паганскага свята, а пазней быў сумешчаны з хрысціянскім Раством ды Новым годам.

У такіх вёсках, як Пагост, падчас Калядаў бабулі п'юць гарэлку проста з пляшак, а моладзь забаўляе ўсіх народнымі гульнямі. Мясцовыя жыхары пераапранаюцца жывёламі, а таксама насаджваюць галовы звяроў на палкі, каб пайсці калядаваць па суседніх вёсках».

Карэспандэнт «НН» дазваніўся ў вёску Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці, дзе быў зроблены здымак. Старшыня сельсавета Міхаіл Алісеравец не ведаў, што яго вёска так прагрымела на ўвесь свет. «У нас тут пры клубе ёсць калектыў «Міжрэчча», яшчэ пры Саюзе яму далі званне народнага, — распавёў ён. — Дык калядны абрад з валачобнікамі — адзін з асноўных у іх. Многа людзей з'язджаецца глядзець». Праўда, сам ён не бачыў: робіць у Пагосце толькі пяць месяцаў.



І што ж, сапраўды старыя бабулькі ў Пагосце п'юць з рыльца? «Відаць, бабка прыкалолася, — кажа Міхаіл Валянцінавіч. — У нас цяпер, шчыра сказаць, часцей маладыя дамы... Аж пра дзяцей забываюць, паскуды».

У вёсцы жыве каля 270 чалавек. («З іх 209 выбарцаў», — удакладняе старшыня.) Працуюць, у асноўным, у калгасе, што ўваходзіць у ААТ «Тураўшчына». Моладзі нямнога, таму школы сваёй няма, дзеці ходзяць у суседні аграгарадок Азяроды.

**Увесь спіс выглядае так:**

1. Рэйк'явік (Ісландыя)
2. Нюрнберг (Нямеччына)
3. Пагост (Беларусь)
4. Зальцбург (Аўстрыя)
5. Сіднэй (Аўстралія)
6. Нью–Ёрк (ЗША)
7. Ганконг (Кітай)
8. Сан–Хуан (Пуэрта–Рыка)
9. Лондан (Брытанія)
10. Бостан (ЗША)

**СМ**

ШОУ І БІЗНЭС

## Галіна Шышкова ўзяла шлюб з футбалістам Юрыем Сыраквашкам

Юрый — маладзейшы за спявачку на дзевяць гадоў.



Сведкам з боку жаніха на вяселлі быў Уладзімір Макоўскі, які некалі выступаў за мінскае і кіеўскае «Дынама», а цяпер дагульвае ў «Гарадзеі».

Юрый Сыраквашка нарадзіўся ў 1985 г., выступае на пазіцыі форварда (пад № 13) за клуб «Гарадзея» з Нясвіжскага раёна, які выйграў чэмпіянат у другой лізе і ў наступным годзе будзе гуляць у 1-й лізе.

Юрый разам з Уладзімірам Макоўскім сталі найлепшымі бамбардзірамі клуба, забіўшы па 23 галы. У чэмпіянаце 2-й лігі гэта чацвёрты паказчык.

На вяселле прыйшло мала народу, зусім не было зорак беларускага шоу-бізнэсу, нават не прыехалі на рэгістрацыю шлюбу бацькі маладых. Усяго на банкет прыйшлі 13 чалавек. Галіна Шышкова гадуе сына Івана ад былога вядучага АНТ Ягора Хрусталёва.

**«Антенна»**

ТЭЛЕФАНІЯ

## Колькі каштуе «яйка» МТС?

Расійская кампанія МТС заявіла пра намер выкупіць уласны брэнд — выяву яйка ў квадраце. Брэнд належыць мацярынскай структуры МТС — АФК «Сістема». За «яйка» кампанія МТС гатова выкласці $438 млн.

У кароткай гісторыі эмтээсаўскага «яйка» ёсць беларускі след. У 2007 годзе паэт Алесь Разанаў і мастак Віктар Маркавец судзіліся з аператарам мабільнай сувязі СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы», спрабуючы адстаяць у судзе аўтарскія правы. Творцы сцвярджалі, што графічны вобраз — белае яйка ў чырвоным квадраце і чырвонае яйка ў белым квадраце — яшчэ ў 1992 годзе прыдумалі яны і далі назву «яйкаквадраты». Маркавец і Разанаў настойвалі, каб кампанія МТС папрасіла ў іх прабачэння на старонках газет за выкарыстанне іхняй інтэлектуальнай уласнасці, а таксама кампенсавала па 620 тысяч рублёў кожнаму (на той час каля $300). У сваю чаргу аператар мабільнай сувязі падаў суду доказы, што яны карыстаюцца выявай абсалютна законна, бо маюць на гэта дазвол ад расійскага ЗАТ «Сістэмы тэлекамунікацый, інфарматыкі і сувязі». У выніку суд паэт і мастак прайгралі.




**Алесь Разанаў і Віктар Маркавец прасілі за свае правы на «яйкаквадрат» у 1 460 000 разоў менш.**

**СП**

НА РОЎНЫМ МЕСЦЫ

## Януковіч і ёлка

Прэзідэнт Украіны ў чарговы раз стаў героем інтэрнэту.

У часе адной з апошніх прэс-канферэнцый Віктар Януковіч загаварыў пра пераднавагоднюю падрыхтоўку ў сталіцы Украіны. «У Кіеве, на месцы, дзе ўчора стаялі палаткі пікетавальнікаў, — з расстаноўкай казаў Януковіч, — сёння ўжо ўсталёўваецца навагодняя...» І тут прэзідэнта закляніла: амаль дзесяць секунд ён прыгадваў слова «ёлка». Трэба сказаць, Януковіч і сам усміхнуўся з недарэчнасці сітуацыі.

Дзякуючы большай за беларускую свабодзе ўкраінскіх тэлеканалаў, гэты фрагмент трапіў на сусветны відэасайт youtube.com. Жартаўнікі зрабілі мантаж, прапанаваўшы параўнаць хуткасць прэзідэнцкай думкі з хуткасцю алімпійскага чэмпіёна, рэкардсмена свету спрынтэра Усэйна Болта. Выявілася, што гэтага часу хапіла б Болту на стаметроўку.

Гэта не першы выпадак, калі Віктар Януковіч робіцца героем інтэрнэту. Камічны інцыдэнт з ім здарыўся ў маі гэтага года, у часе візіту Дзмітрыя Мядзведзева ў Кіеў. Прэзідэнты дзвюх краін ускладалі вянкі да помніка невядомаму салдату. І моцны парыў ветру скінуў вянок на прэзідэнта Украіны. Пазней той вянок быў прададзены на аўкцыёне за $5,5 тысячы. Цікава, колькі будзе каштаваць «ёлка»?



**СП**

ЗДАРЭННІ СЦІСЛА

• **Уцякаючы ад ДАІ, кіроўца збіў 9-гадовую дзяўчынку.** Гэта здарылася ў Мінску на вуліцы Якуба Коласа. 39-гадовы кіроўца «Жыгулёў» уцякаў ад машыны ДАІ, бо ехаў без правоў (у яго іх забралі за кіраванне п'яным). Аб'ехаўшы збітае дзіця, хацеў уцякаць далей, але быў затрыманы. Дзяўчынка засталася жывая.

• **Міліцыянт-забойца асуджаны.** Гомельскі абласны суд даў 18 гадоў турмы былому ўчастковаму Рагачоўскага РАУС. Той быў забіў з табельнага пісталета 22-гадовую дзяўчыну. Трагедыя адбылася ў купальскую ноч у вёсцы Журавічы. Паводле сведкаў, міліцыянт быў п'яны.

• **У Мінску павесіўся дырэктар Новасібірскай оперы.** Руслан Яфрэмаў прыехаў у Мінск на міжнародны калядны оперны форум. Яго знайшлі павешаным у нумары гасцініцы «Вікторыя» 9 снежня. Яму было 39 гадоў.

• **Дзесяцікласнік з Мінска падмануў 15 выпадковых знаёмых.** Ён угаворваў людзей на вуліцы браць для яго ў крэдыт ноўтбукі і тэлефоны. Схема дзеяння 16-гадовага школьніка была немудрагелістая, але патрабавала ўмелай псіхалагічнай апрацоўкі ахвяры. Падлетак знаёміўся з чалавекам. Падчас даверлівай гутаркі казаў, што ён з Расіі, а ў Мінску знайшоў мадэль ноўтбука (тэлефона і г.д.), якую даўно шукаў. Поўнай сумы для набыцця рэчы пры сабе няма, але ён гатовы скарыстацца крэдытам, які, у сваю чаргу, не можа аформіць, бо з'яўляецца грамадзянінам іншай дзяржавы. Фактычна незнаёмыя людзі пагаджаліся аформіць крэдыт на сваё імя. Юнак абяцаў своечасова пагашаць крэдыт. Але, атрымаўшы на рукі дагаворы, ноўтбукі, малады чалавек знікаў. Вядомая колькасць пацярпелых складае 15 чалавек.

• **У 33-гадовай мінчанкі канфіскавана 20 літраў опіуму.** За незаконны абарот наркатычных сродкаў яе затрымалі. Ёй пагражае пяць гадоў турмы. Двое яе малалетніх дзяцей перададзены на апеку дзяржавы.

• **Зламаў нагу ўчастковаму.** Жыхарка вёскі Забалацце Рагачоўскага раёна выклікала міліцыю ў сувязі са скандалам, які ўчыніў яе 48-гадовы сужыцель. Ён пачаў супраціўляцца міліцыянтам. Пасля ўдару нагой адзін з міліцыянераў паваліўся, на яго ўпаў хуліган, у выніку ўчастковы атрымаў траўму.

• **Касірка скрала сем мільёнаў.** 20-гадовай магазіншчыцы для гэтага хапіла ўсяго два месяцы працы. Ведаючы код на адмену касавых аперацый, дзяўчына прысабечвала грошы, атрыманыя ад кліентаў. Махінацыі яна здзяйсняла штодня. Выявіць іх змагла б толькі поўная рэвізія. Дзяўчыне пагражае да трох гадоў пазбаўлення волі.

**СМ**

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

## Насці Навумавай назбіралі грошай на аперацыю

Але гэтага мала — патрэбныя сродкі на перабыванне ў Германіі і на рэабілітацыю.

Насці Навумавай з Рэчыцы патрэбная тэрміновая аперацыя. Свае паслугі прапануе шматпрофільная клініка медыцынскага ўніверсітэта Гросхадэрн Мюнхен Баварыя. На сёння сабраная неабходная для правядзення аперацыі сума — $25 тысяч. Гэтага хопіць яшчэ і на тыдзень перабывання ў Германіі. Але знаходзіцца там трэба не менш за месяц, акрамя таго спатрэбіцца каля тысячы еўра на камп'ютарную тамаграфію, і асобна на рэабілітацыйны перыяд. Насця з мамай збіраецца на лячэнне пры канцы месяца. Збор сродкаў для Насці Навумавай працягваецца.

Кантакты: маці — Навумава Алена Яўгенаўна (29) 6184756.

РЭКВІЗІТЫ:

ААТ ААБ «Беларусбанк», філіял №323, г. Рэчыца, вул. Леніна, 51А
УНП 400230587
МФА 15150682

Беларускія рублі: транзітны рахунак №3819382102841 для залічэння на дабрачынны рахунак №000000032

Даляры ЗША: транзітны рахунак №3819382107035 для залічэння на дабрачынны рахунак №8400000000066

Еўра: для залічэння на дабрачынны рахунак №9780000000021

Расійскія рублі: для залічэння на дабрачынны рахунак №6430000000016

Разліковы рахунак №6111000000093 код 795 у ААТ «АСБ Беларусбанк» для Навумавай Алены Яўгенаўны.

Таксама можна перавесці грошы для Насці на наш кашалёк EasyPay 08492425 з пазнакай «для Насці Навумавай».

**Паводле krasnapolskaia.livejournal.com**




## СПОРТ

### «Дынама» супраць «Барыса»

**22 снежня ў «Мінск-Арэне»** — чарговая гульня Кантынентальнай хакейнай лігі. У госці да мінскага «Дынама» прыедзе «Барыс» з Казахстана. Менавіта з Астаны ў Беларусь у міжсезонні перайшла вядучая «тройка» «Дынама» — Спірыдонаў, Глазачаў, Штумпел.

## КАНЦЭРТЫ

### «Гусляр» Купалы ў Філармоніі

**17 снежня ў Белдзяржфілармоніі**, падчас святочнага канцэрта да 80-годдзя Акадэмічнага Народнага аркестра Беларусі імя І.Жыновіча, адбудзецца прэм'ера музычнага спектакля «Гусляр» І. Лучанка і Ул. Мулявіна паводле паэмы Я. Купалы «Курган». Прэм'еру з аркестрам ладзяць Дзяржаўны камерны хор, рок-гурт «Лявоны», фальклор-тэатр «Госціца» і выканаўцы галоўных роляў — Пётр Ялфімаў і Ян Жанчак. Новая інструментальная версія створана Аляксандрам Крамко. Рэжысёрскае ўвасабленне — Ларыса Сімаковіч.

### Тоні Брэкстан

**18 снежня ў Мінску** выступіць сусветна папулярная соул-спявачка, уладальніца шасці прэмій «Грэмі» Тоні Брэкстан. Яе называюць «другой Уітні Х'юстан». Канцэрт пройдзе **ў «Мінск-Арэне».** Білеты кусаюцца: ад 100 да 370 тысяч рублёў.




### ТТ-34

**18 снежня ў R-club'e (вул.Сурганава, 26)** выступае гурт з Гомеля **«ТТ-34»**, які іграе хардкор і нюметал. Удзел у канцэрце возьмуць таксама калегі па цэху **Clan** і **«Рыкашэт». Пачатак а 19-й.**

### Свята

**15 снежня ў Вялікай зале філармоніі** — ансамбль народнай музыкі «Свята». **Пачатак а 19-й.**

### Вольга Акуліч

**16 снежня ў Музеі Янкі Купалы (вул.Купалы, 4)** выступіць пераможца «Бардаўскай восені» Вольга Акуліч з бард-гуртом «Верасень». Квіткі — 10 тысяч, у дзень канцэрта — 13 тысяч рублёў. Даведкі: (29) 640-09-38.

### Калядны вечар з Моцартам

**18 снежня а 19-й у Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20)** пройдзе канцэртная праграма Аляксандра Анісімава «Калядны вечар з Моцартам». Бяруць удзел камерны склад Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра, дырыжор Ігар Бухвалаў і саліст Джакома Батарына (фартэпіяна).

## ВЫСТАВЫ

### Вернутыя імгненні. Яўрэі царскай Расіі

**Да 16 снежня ў Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12)** працуе выстава «Вернутыя імгненні. Яўрэі царскай Расіі». На выставе можна ўбачыць фоты з калекцыі Расійскага этнаграфічнага музея, а таксама рарытэтныя рэчы сакральнага і побытавага прызначэння традыцыйнай яўрэйскай культуры з калекцый Гістарычнага музея Беларусі.

### Кола агню

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) да 25 снежня** працуе выстава «Кола агню» па выніках VIII Міжнароднага пленэра «Арт-Жыжаль». У пленэры ўзялі ўдзел прадстаўнікі Беларусі, Венесуэлы, Германіі, Літвы, Малдовы, Расіі, Украіны.

### Прагулкі па Парыжы

**У Мастацкім музеі да 8 лютага** працуе выстава твораў беларускай мастачкі Ірыны Котавай «Прагулкі па Парыжы». У экспазіцыі прадстаўленыя больш за 40 твораў мастачкі, выкананыя ў тэхніцы пастэлі.

### Юдаль Пэн у Мінску

**У Музеі Якуба Коласа (вул. Акадэмічная, 5) да 21 снежня** працуе выстава партрэтаў і краявідаў Юдаля Пэна. У экспазіцыі — 23 працы майстра з калекцыі Віцебскага краязнаўчага музея. Акрамя таго, дэманструюцца 40 паштовак з краявідамі Віцебска пачатку XX стагоддзя.

### Выстава да 150-годдзя Яўхіма Карскага

Выстава «Спадчына акадэміка Яўхіма Карскага» да 150-годдзя з дня яго нараджэння адкрылася **9 снежня ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі**. У экспазіцыі дэманструюцца ўнікальныя выданні з асабістага кнігазбору Карскага. Кнігі маюць дарчыя надпісы, паметкі і запісы акадэміка. У экспазіцыю ўвайшлі раней невядомыя дакументы з архіваў, у тым ліку кліравыя ведамасці са звесткамі пра бацьку акадэміка — святара Фёдара Навіцкага, праграмы лекцый вучонага па беларускай мове і літаратуры у Мінскім педінстытуце, дакументы аб удзеле ў стварэнні Беларускага дзяржуніверсітэта. Выстава працуе да 15 студзеня 2011 года.

## ТЭАТРЫ

**16 снежня**

**Лялек** — «Балада пра белую вішню»
**Купалаўскі** — «Вячэра з прыдуркам»
**Горкага** — «Утаймаваньне наравістай»
**Купалаўскі** — «Зіма»
**Беларускай драматургіі** — «Сёстры Псіхеі»
**Оперы і балета** — «Сельскі гонар»

**17 снежня**

**Лялек** — «Дом, каторы збудаваў Свіфт»
**Горкага** — «Ніначка»
**Беларускай драматургіі** — «Адвечная песня»
**Оперы і балета** — «Лебядзінае возера»

**18 снежня**

**Лялек** — «Чырвоны Каптурок»
**Беларускай драматургіі** — «Гісторыя двух сабак»
**Горкага** — «Рускія вадэвілі»
**Оперы і балета** — «Трубадур»

**19 снежня**

**Лялек** — «Вясёлы цырк»
**Оперы і балета** — «Тры парсючкі»
**Беларускай драматургіі** — «Дамавічкі»
**Оперы і балета** — «Багема»
**Горкага** — «Васа»

**20 снежня**

**Тэатр-студыя кінаактора** — «Майстар і Маргарыта»
**Беларускай драматургіі** — «Сублімацыя кахання»
**Купалаўскі** — «Пінская шляхта»
**Купалаўскі** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»

**21 снежня**

**Музычны** — «Даратэя»
**Оперы і балета** — «Іаланта»
**Горкага** — «Эсфір»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Вельмі простая гісторыя»
**Беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»
**Купалаўскі** — «ГендэльБах»

**22 снежня**

**Музычны** — «Вясёлая ўдава»
**Горкага** — «Дзева і смерць»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Вельмі простая гісторыя»
**Беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»
**Купалаўскі** — «ГендэльБах»

**23 снежня**

**Музычны** — «Жызэль»
**Оперы і балета** — «Мадам Батэрфляй»
**Горкага** — «Распуснік»
**Юнага гледача** — «Пані Завіруха»
**Беларускай драматургіі** — «Гісторыя двух сабак»
**Купалаўскі** — «Зіма»

**24 снежня**

**Сучасны мастацкі** — «Мінск, я люблю цябе»
**Горкага** — «Ідэальны муж»
**Юнага гледача** — «Пані Завіруха»

**25 снежня**

**Хрыстафор** — «Не жаночая гэта справа!»
**Лялек** — «Марозка»
**Вялікая зала філармоніі** — «Музычныя прыгоды ў навагоднюю ноч»
**Беларускай арміі** — «Прынцэса і салдат»
**Сучасны мастацкі** — «Навагоднія канікулы ў Прастаквашыне»
**Юнага гледача** — «Пані Завіруха»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Шчаўкунок»

## КІНО

### Хронікі Нарніі: Заваёўнік золку

The Chronicles of Narnia: The Voyage of the Dawn Treader

ЗША, 2010, каляровы, 112 хв.

**Рэжысёр:** Майкл Эптыд

**Жанр:** Фэнтэзі паводле кнігі К.С.Льюіса

**Адзнака:** 6 (з 10)




Эдмунд, Люсі і іх стрыечны брат Юстас трапляюць у Нарнію — на карабель «Заваёўнік золку», які плыве на край казачнага свету. Героі мусяць адшукаць сем лордаў і спыніць зялёны туман, што нішчыць людзей.

«Хронікі Нарніі» Майкла Эптыда — трэцяя серыя казачных прыгод у краіне, дзе пацукі і мінатаўры балбочуць, дзеці — каралі і прынцэсы, а дзівосы на кожным кроку. Эдмунд і Люсі не ўпершыню ў Нарніі, затое іх брат, злоснік і шкоднік, не чакаў такіх прыгодаў. За яго выхаванне возьмецца маленькі пацук з вялікім сэрцам, уся каманда карабля і чароўныя сілы.

Майкл Эптыд — годны рамеснік, які фэнтэзі не псуе, але і завялікіх чараў у стужку не дадае. Затое хрысціянскія алюзіі ў гэтай карціне найбольш відавочныя. Каб перамагчы зло, трэба змагацца з ім ва ўласных душах. Зялёны туман — д'ябальскае спакушэнне. Ну а леў Аслан сам прапануе героям здагадацца, кім ён ёсць у рэальным жыцці.

Непыхлівая, прыгожая казка для ўсёй сям'і.

**Андрэй Расінскі**






# БАТЭ ў Алкмаар прыехаў з Рыма

Каманда на чале з Віктарам Ганчарэнкам трэці год запар адправілася ў прыгарад Рыма. Там яна рыхтавалася да апошняга матча сезона-2010.

У выязны склад былі ўключаны 19 футбалістаў: Верамко, Гутар, Шчарбакоў, Ліхтаровіч, Шытаў, Сасноўскі, Юрэвіч, Паўлаў, Бардачоў, Глебко, Валадзько, Канцавы, Радзькоў, Брэсан, Нехайчык, Аляхновіч, Д. Бага, Радзівонаў, Скавыш.

У спісе футбалістаў адзін пачатковец — галкіпер Андрэй Шчарбакоў (1991 года нараджэння), які заключыў кантракт з клубам. У двух мінулых сезонах ён выступаў у дублюючым складзе «Віцебска».

У планах Віктара Ганчарэнкі было правядзенне кантрольнага матча з адным з клубаў італьянскай лігі «С». А 13 снежня БАТЭ перабраўся ў нідэрландскі Алкмаар, дзе 15 снежня павінна была адбыцца гульня з мясцовым AZ.

Нагадаем, што ў нашай групе «Е» БАТЭ і кіеўскае «Дынама» датэрмінова гарантавалі сабе пуцёўкі ў 1/16 фіналу Лігі Еўропы. У апошнім туры выршыцца лёс першага месца, што дае выгоды пры лёсаванні.

**Пасля 5 тураў:** Дынама — 10 пунктаў (3 перамогі, 1 нічыя, 1 параза, розніца мячоў 10—6), БАТЭ — 10 (3, 1, 1, 11—8), AZ — 4 (1, 1, 3, 5—10), Шэрыф — 4 (1, 1, 3, 5—7).

«Дынама» і AZ знаходзяцца вышэй за БАТЭ і «Шэрыф» за кошт асабістых сустрэчаў.



**Віктар Ганчарэнка прызнаны найлепшым трэнерам года.**

## Памёр Аляксандр Гарбылёў

На 88-м годзе жыцця 7 снежня памёр вядомы футбольны спецыяліст Аляксандр Гарбылёў, паведаміла Беларуская федэрацыя футбола.

Гарбылёў з 1962 па 1990 гады працаваў трэнерам, старшым трэнерам, начальнікам футбольнай каманды «Дынама» (Мінск), а таксама на іншых пасадах у фізкультурна-спартыўным таварыстве «Дынама».

Шмат гадоў інспектаваў матчы чэмпіянату Беларусі па футболе, набыўшы славу аднаго з самых прынцыповых інспектараў.

**Дзмітрый Уласаў, БелаПАН**

### ІНТЭРНЭТ

• **У інтэрнэт-кавярню прапусцяць без пашпарта?** Аператыўна-аналітычны цэнтр пры прэзідэнце накіраваў у Савет Міністраў ліст, у якім прапанаваў адмяніць абавязковую ідэнтыфікацыю карыстальнікаў інтэрнэт-кафэ ў Беларусі.

• **У маршрутках з'явіцца бясплатны інтэрнэт.** Пра гэта паведаміў дырэктар аўтацэнтра Ford «Атлант-М Баравая» Сяргей Елістратаў. Сістэма будзе рэалізавана на аснове тэхналогіі 3G. Першыя «інтэрнэт-таксі» павінны з'явіцца і пачаць працу ў тэставым рэжыме ўжо ў студзені 2011 года. Яны з'явяцца ў Мінску, Віцебску, а таксама на міжгародніх маршрутах.

• **Безлімітны інтэрнэт byfly стане хутчэйшым.** «Белтэлекам» ізноў павялічыць хуткасць доступу для ўсіх безлімітных тарыфаў byfly (група тарыфаў «Дамасед»). Цяпер абаненты тарыфнага плана «Дамасед» могуць выходзіць у сетку пры хуткасці 512 кілабіт у секунду, а абаненты «Супер Дамаседа» — 4 мегабіты ў секунду. Якой стане хуткасць доступу ў інтэрнэт для гэтай групы тарыфаў пасля снежаньскіх змяненняў, нацыянальны аператар сувязі не раскрывае. Абанентамі byfly з'яўляюцца каля 750 тыс. чалавек.

**МБ**

### ТАМ, ДЗЕ НАС НЯМА

## Польшча адмяняе патрабаванне аб дазволе на працу для беларусаў

З 1 студзеня 2011 года грамадзяне Беларусі, Расіі, Грузіі, Малдовы і Украіны змогуць працаваць у Польшчы без дазволу на працу.

Адпаведнае распараджэнне падпісала міністр працы Польшчы Ялантa Федак. Каб працаваць, досыць будзе кантракта з працадаўцам.

Такім чынам Варшава спадзяецца прывабіць кваліфікаваную працоўную сілу з усходу. Беларусі пагражае паскарэнне «ўцёкаў мазгоў». Каб запабегчы, Беларусі трэба забяспечыць рост заробкаў да еўрапейскага ўзроўню.

**Мікола Бугай**

### ДОБРАГА ЗДАРОЎЯ!

## Эпідэмію грыпу дактары прагназуюць пасля Новага года

Беларускія эпідэміёлагі прагназуюць эпідэмію сярэдняй інтэнсіўнасці. Каб не хварэць, трэба добра высыпацца і рэгулярна займацца спортам. Дапамагае і насычаная вітамінамі дыета.

Узімку самая пара есці квашаную капусту, лімоны і гранаты. А вось хурма падсілкуе Ваш арганізм мікраэлементамі.

**Сяргей Гезгала**

# Адукацыя пад акупацыяй. 1915—1918



Школьная адукацыя ў Беларусі падчас нямецкай акупацыі (1915–1918) / Уладзімір Ляхоўскі. — Вільня: Інстытут беларусістыкі; Беласток: Беларускае гістарычнае таварыства, 2010. — 340 с.

Гісторык Уладзімір Ляхоўскі выдаў захапляльную манаграфію.

Школьніцтва ў Беларусі за гэты непрацяглы час перажыло чатыры ўладныя рэжымы: расійскую манархію, нямецкую акупацыю, расійскі Часовы ўрад, савецкую ўладу. «Пры гэтым найбольш недасledаваным застаецца пытанне аб становішчы школьнай асветы на беларускіх землях, якія аказаліся ў 1915—1918 гг. пад акупацыяй кайзераўскай Нямеччыны», — сцвярджае аўтар.

Вядома, што менавіта ў «кайзераўскі час» беларусы дабіліся першых школ на роднай мове. «Мовай выкладання павінна быць родная (матчына) мова. Навучанне рэлігіі павінна адбывацца толькі на роднай мове, а ў яўрэяў на мове іх рэлігіі», — загадвалася ў пастанове галоўнага камандзіра нямецкага Усходняга фронту «Асноўныя напрамкі па адраджэнню школьнай справы ў Обер Ост» 22 снежня 1915 года.

Уладзімір Ляхоўскі піша пра нацыянальнае школьніцтва не толькі беларусаў, але і палякаў, яўрэяў, літоўцаў, татараў. Піша ён і аб няўдалай спробе ў 1918 годзе стварыць краёвы ўніверсітэт у Беларусі.

У кнізе выкарыстана больш за сотню ілюстрацый, частка з каторых публікуецца ўпершыню. У дадатку друкуюцца дакументы і статыстычныя дадзеныя па тэме.

Пытайцеся ў кнігарнях і кніганошаў.

**Уладзімір Ляхоўскі**

кандыдат гістарычных навук. У сферу яго навуковых інтарэсаў уваходзіць гісторыя беларускага нацыянальнага руху. Адзін з укладальнікаў зборніка «Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакументах і ўспамінах».

**У склад Обер Ост**

уваходзілі тэрыторыя Ковенскай і Гарадзенскай губерняў, Віленскі, Ашмянскі, Лідскі, Свянцянскі, Трокскі паветы, часткі Вілейскага і Дзісенскага паветаў, заходнія воласці Дзвінскага павета, часткі Наваградскага і Пінскага паветаў.

## Сапраўдная беларуская кухня

### Хрэн да мяса

Карэнне хрэну, буракі, соль, воцат, соль.

Карэнне хрэну пачысціць і замарозіць, каб можна было нацерці без праблем. Замарожанае карэнне нацерці, раздзяліць у прапорцыі 2:1. Дадаць соль, воцат. Калі любіце прыправу бурачнага колеру, дадаць яшчэ бурака.

Выкарыстоўваць як прыправу для мясных страваў.

**НБ**

## Прыватныя абвесткі

### ВІНШУЕМ

**Адметнаму дзеячу беларускай культуры, выдатнаму драматургу Алесю Петрашкевічу спаўняецца 80 гадоў.** Добрага здароўя Вам, спадар Петрашкевіч, і сілы, каб працаваць!

**Любімага барда Андрэя Мельнікава з Днём нараджэння!** Андрэй, Вашы песні «Казка», «ВЫйдзі», «Аршанская бітва», «Гэта мы» — супер! Віншуем! Ваша «Гэта мы» — нацыянальны брэнд! Нашы слоганы перамагаюць!

### ЗДЫМУ ПАКОЙ

**Пажадана па Маскоўскай лініі метро** або са зручным даездам. Зміцер. Т.: (029) 761–16–08.

### КНІГІ

**Шукаю 1-е выданне «Гісторыі Беларусі» Доўнар-Запольскага** (Мінск, 1994). Т.: (029) 399–87–16. Яўген.

**Прадам збор твораў Вальтэра Скота** ў васьмі тамах. Танна. Т.: 8–0164–53–00–02.

**Кнігу У. Арлова «Імёны свабоды»** прадам. Т.: (029) 332–69–56. Святлана.

**Прадаю тлумачальны слоўнік рускай мовы Уладзіміра Даля** ў 4 тамах (100 тыс.). Т.: 8–0177–74–56–67. Антон.

### ПАТРАБУЕЦЦА

**Патрабуецца дапамога ў даглядзе інваліда** (жанчыны) у Гродне. Т.: (029) 582–51–34.

**Патрабуецца дапамога у даглядзе пажылой жанчыны** у Смалявічах. Т.: (029) 111–45–97.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі



1) Пеця аддаў свайму малодшаму брату палову сваіх алоўкаў, а пасля яшчэ адзін. Пасля гэтага ў Пеці не засталося ніводнага алоўка. Колькі алоўкаў было ў Пеці?

2) Як размясціць 45 трусоў у 9 клетак, каб у кожнай клетцы іх была розная колькасць?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**
**Адказы глядзі на старонцы 16.**




**Напярэдадні выбараў у Гродне скончыўся марафон БРСМ «Зрабі свой выбар», пакліканы «наглядна прадэманстраваць вялізную колькасць моладзевых праектаў, увасабленне якіх у жыццё стала магчымым дзякуючы ўвазе кіраўніцтва дзяржавы да моладзевай палітыкі».**




**Ідэалагічна выверанае месца для курэння ў Салігорску.**




**Беларускія габрэі адсвяткавалі Хануку. У Гродне сёлета была ўпершыню запаленая ханукалія.**




**Студэнты пратэстуюць супраць мераў эканоміі ў Грэцыі і Брытаніі. Апошнія гады многія еўрапейскія краіны жылі не па сродках, а цяпер імкнуцца збалансаваць свой бюджэт. На фота: фаланга нашага часу ля будынка парламента ў Афінах.**



**Сланяня ў Гановерскім заапарку (Германія) радуецца снегу, як мамант.**




**Акадэмія музыкі закупіла ўнікальную скрыпку Гварнэры.**

## Анекдоты

* * *

Калі жонка разбіла кубак — гэта на шчасце, а калі ты — рукі не з таго месца растуць.

* * *

Толькі студэнты і школьнікі на пытанне «Якая гадзіна?» адказваюць: «Дзесяць хвілін засталося!»

* * *

— Я, здаецца, нешта прапусціў?

— Так, адну прыступку эвалюцыі!

* * *

Ці ведаеце вы, што да Францыска Скарыны ўсе словы ў Беларусі былі не для друку?

* * *

Падчас падключэння новага дома ледзь не адбылася трагедыя: пад канец трэціх сутак напружанай працы па замене трэснутых трубаў на другой нітцы цеплацэнтралі ў рамонтнай брыгады сантэхнікаў ЖРЭА нечакана скончыліся мацюкі.

* * *

Нішто не выклікае такой моцнай панікі, як крык «Толькі без панікі!».

* * *

WikiLeaks збіраецца апублікаваць спіс Санта Клаўса з пералікам дрэнных і добрых дзяцей.

## «НН» сто гадоў з вамі

**Мінск.** Толькі ў жыдоўскай харальнай сінагозе была паніхіда па Л.М.Талстым. Было шмат і хрысціян.

[За крытыку царквы праваслаўны сінод адлучыў пісьменнніка.]

**«НН». №49. 1910**

**Шэйман прызначаны Генеральным пракурорам.** Пасада пракурора — адна з нешматлікіх, што патрабуе спецыяльнай юрыдычнай адукацыі. Пракуратура ў любой дзяржаве ажыццяўляе нагляд і кантроль за дакладным выкананнем законаў усімі галінамі ўлады, а таксама — грамадзянамі. Дзеля гэтага трэба ўмець адрозніваць крадзеж ад махлярства альбо наўмысныя дзеянні — ад звычайнай нядбайнасці. Вядома, мы добра разумеем, каму спатрэбіўся генерал-танкіст з пракурорскім шчытом.

**«НН». №50. 2000**

**Адказы да старонкі 15:**

1) 2; 2) 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9.

**Наша Ніва**
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.**
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6450.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 14.12.2010.
Замова № 6047.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9 771819 161008 10047